


Калі зірнем мы на тое, што за некалькі год зроблена намі, беларусамі, над падняцьцем свайго нацыянальнага багацтва, то адно толькі душа можа радавацца. У некалькі год мы зрабілі тое, што ў палякаў і расейцаў рабілася чуць ня цэлымі сталецьцямі. Выходзіць у сьвет колькі беларускіх газэт, друкуюцца кожны год дзясяткі кніжак розных названьняў, закладаюцца беларускія выдавецкія суполкі, кнігарні і т.п. І ўсё гэта робіць сам народ ці сваёй шчырай працай для Бацькаўшчыны, ці сваімі запрацаванымі капейкамі, аддаванымі на беларускія газэты, кніжкі. Працуем для ідэі і будуем самі сабе новае, лепшае жыцьцё.

Дык працуйма ж далей! Ня будзе нам страшны гэты паганы над намі торг нашых нязваных і насланых апекуноў.

**Янка Купала,**
**рэдактар «Нашай Нівы»**
**1914**

**№ 25 (527)** 6 ліпеня 2007 **www.nn.by**

# Наша Ніва

П Е Р Ш А Я   Б Е Л А Р У С К А Я   Г А З Э Т А   ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

### Беларусі прадыктавалі ўмовы атрыманьня расейскага крэдыту

На перамовах Фрадкова зь Сідорскім 29 чэрвеня Расея выставіла новыя патрабаваньні. **Старонка 9.**

### Чавэс і Лукашэнка хочуць кіраваць яшчэ 20 гадоў

Пасьля Масквы, дзе яго сустрэлі даволі холадна, прэзыдэнт Вэнэсуэлы Уга Чавэс, у кампаніі сваіх сына, дачкі і ўнукаў, пабываў у Беларусі. **Старонка 4.**

### Устаноўчы зьезд «Белай Русі» адбудзецца ўвосені

У Аргкамітэт увайшлі прадстаўнікі ўсіх сацыяльных групаў. **Старонка 6.**

### Янычары XXI стагодзьдзя

Юбілейны тыдзень Янкі Купалы ў аглядзе Віталя Тараса. **Старонка 11.**

### 73 працэнты абітурыентаў выбралі беларускую мову

Нягледзячы на перавод выкладаньня гісторыі на расейскую мову, здаваць па-беларуску захацела большасьць. **Старонка 7.**

### У Менску зьявіліся мікрараён Брылевічы і вуліца Ігнатоўскага

Жэстам прымірэньня з Польшчай выглядае зьяўленьне вуліцы Гедройца. **Старонка 5.**

## АПЫТАНЬНЕ НА NN.BY

**А для Вас 3 Ліпеня сьвята?**

| | |
|---|---|
| так, сьвята | 52 (12.3%) |
| не, ня сьвята | 232 (55.0%) |
| сьвята выезду за горад | 138 (32.7%) |

Усяго прагаласавала: 422




# Дні Купалы ў Купалаўскім

«Тутэйшыя» і «Сны аб Беларусі» ў юбілейныя дні.

Вясёлай «Паўлінкай» 4 ліпеня Нацыянальны акадэмічны тэатар імя Янкі Купалы распачаў дні паказу твораў, прысьвечаныя 125-годзьдзю Янкі Купалы.

5 ліпеня Купалаўскі тэатар запрашае на легендарны спэктакль «Тутэйшыя» ў пастаноўцы Пінігіна.

6 і 8 ліпеня можна будзе пабачыць прэм'еру «Сны аб Беларусі» паводле п'есы Уладзімера Караткевіча «Калыска чатырох чараўніц» і выбраных твораў Янкі Купалы (рэцэнзію на гэты спэктакль чытайце на старонцы 14).

У гэтыя сьвяточныя дні на сцэну выйдуць зоркі беларускага тэатру: Генадзь Аўсянікаў, Марыя Захарэвіч, Генадзь Гарбук, Арнольд Памазан, Мікалай Кірычэнка, Зоя Белахвосьцік, Віктар Манаеў, а таксама найлепшыя акторы маладзейшага пакаленьня.

**Ул.інф.**

# «Рух за Свабоду» ладзіць сьвята ў Вязынцы

Аргкамітэт Руху «За Свабоду» 7 ліпеня (субота) зьбіраецца зладзіць імпрэзу ў Вязынцы (Маладэчанскі р-н) да 125-годзьдзя Янкі Купалы.

А 12:00 у Вязынцы пачнецца афіцыйнае сьвяткаваньне, якое ладзіцца мясцовымі ўладамі і чаргінцоўскім саюзам пісьменьнікаў. Сябры Аргкамітэту заклікаюць сваіх прыхільнікаў сабрацца недалёка ад помніку Янку Купалу дзесьці а 14:30, пасьля таго як скончыцца афіцыйная частка. На імпрэзе будуць выступаць бард Віктар Шалкевіч і гурт «Рэха», магчыма, таксама Кася Камоцкая і Эдуард Акулін. Справа скончыцца сьвяточным пікнікам.

Мае прыехаць і Аляксандар Мілінкевіч.

У Вязынку можна даехаць электрычкамі Менск—Маладэчна, Менск—Алехнавічы з чыгуначнага вакзалу.

**ЗП**

# Сем гадоў таму зьнік Завадзкі

7 ліпеня журналісты Беларусі ўзгадваюць Дзьмітрыя Завадзкага, які зьнік пры нявысьветленых абставінах у 2000 годзе. За ягонае выкраданьне асуджаныя былыя байцы з часьці палкоўніка Паўлічэнкі. Аднак па сёньня невядома, што з Завадзкім стала. Сем год маўчаць улады і дзяржаўныя СМІ.

Мы помнім Зьмітра.



## КАМЭНТАР РЭДАКЦЫІ

# Яшчэ раз аб Праграме Каліноўскага: перабор

Стварэньне Праграмы Каліноўскага было вялікім праектам, і масавы разавы набор мінулага году зрабіў вялікае ўражаньне. Ён вывеў з-пад удару многіх маладых людзей. Унівэрсытэтам быў дадзены загад устрымліваецца ад выключэньня студэнтаў. У гэтым быў галоўны посьпех праграмы, інвэстыцыя ў будучыню.

Цяпер важна рацыянальна выкарыстаць адкрытыя магчымасьці.

Стала вядома, што сёлета па Праграме Каліноўскага толькі Польшча гатовая прыняць 70 беларускіх студэнтаў.

Безумоўна мусяць мець магчымасьць навучацца выключаныя з унівэрсытэтаў за палітыку — як Юрась Алейнік, а таксама тыя, каму пагражае рэальная небясьпека. Аднак такіх няшмат, бадай, намнога менш за 70 чалавек. Ахоп праграмай іншых людзей супярэчыў бы ідэалам Каліноўскага. Скарачэньне колькасьці скрыўджаных, выключаных — задача і крытэр посьпеху праграмы. Пагоня за колькасьцю, наадварот, дыскрэдытавала б стваральнікаў праграмы і размывала прынцыпы незалежнага грамадзтва.

Удзел у альтэрнатыўных палітычных асяродках ці навучаньне ў альтэрнатыўных навучальных установах не павінны быць падставамі для выезду на вучобу за мяжу. Гэта, урэшце, скрыўляла б лёсы саміх юнакоў, як любая незаслужаная ўзнагарода.

### «Нашу Ніву» ўганаравалі ў Нобэлеўскім інстытуце

У Нобэлеўскім інстытуце ў Осла адбылася ўрачыстая цырымонія ўзнагароджаньня прэміяй імя Герда Буцэрыюса. Сярод сёлетніх ляўрэатаў — газэта «Наша Ніва», беларускі мультымэдыйны праект «CD-mag», а таксама чатыры выданьні ад Расеі і Азэрбайджану.

Паводле журы, «усе ляўрэаты — сьмелыя людзі, працуюць ва ўмовах жорсткага ціску ўладаў»

Гэтая прэмія для журналістаў была заснаваная ў 1999 годзе.

# Ваза, дзеці, прэзыдэнт




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Сёлета сьвяткаваньне мала розьнілася ад мінулых гадоў.

Хіба што толькі не было традыцыйнай дэманстрацыі вайсковай і сельскагаспадарчай тэхнікі.

Разам з тым парад традыцыйна пачыналі менавіта будучыя вайскоўцы — курсанты Суvotraўскай вучэльні і студэнты Вайсковай акадэміі. Пасьля іх цьвёрда чаканілі крок перад прэзыдэнтам прадстаўнікі розных ваенных частак і падразьдзяленьняў — ад спэцназу да сувязістаў, ад дэсанту да памежнікаў.

Былі яшчэ вайскоўцы, апранутыя ў форму савецкіх салдатаў часоў вайны.

Побач з А.Лукашэнкам на трыбуне стаялі менавіта «сілавікі» Віктар Шэйман, Леанід Мальцаў, Уладзімер Навумаў, Генадзь Нявыглас. А ўжо на іншай трыбуне — Сяргей Сідорскі, Генадзь Навіцкі, Уладзімер Канаплёў.

Перад Лукашэнкам вайскоўцы паказвалі сваё ўменьне карыстацца зброяй і іншыя практыкаваньні, якія нагадвалі мілітарысцкія танцы.

Сам кіраўнік дзяржавы ня быў у вайсковай форме, але ў прамове засяродзіўся менавіта на пытаньнях бясьпекі краіны.

Лукашэнка ўспомніў пра пашырэньне інфраструктуры NATO на Ўсход, а таксама пра ўсталяваньне амэрыканскіх сыстэмаў супрацьракетнай абароны ў суседніх зь Беларусьсю дзяржавах. Гэта ўсё, на думку кіраўніка дзяржавы, адбываецца «пры маўчаньні эўрапейскіх дэмакратычных краін».

«Аднабаковае раззбраеньне немагчымае», — казаў Лукашэнка. Пасьля дадаў пра тое, што нягледзячы на эканамічныя цяжкасьці ў адносінах з Расеяй ранейшым застаецца курс на саюзнае будаўніцтва, і беларускі бок будзе працягваць бараніць межы саюзнай дзяржавы.

Лукашэнка спыніўся на пагрозах для беларускай незалежнасьці. Сярод найбольш значных пагрозаў «інфармацыйная экспансія, палітычны шантаж, санкцыі, эканамічныя рычагі ўплыву, усе гэтыя мэтады ўжываюцца супраць краінаў, якія праводзяць незалежную палітыку».

Сваю прамову Лукашэнка скончыў словамі: «Няхай заўсёды будзе мірнае неба».

Лягічна, што сьледам за вайскоўцамі ў парадзе пачалі ўдзельнічаць спартоўцы. Былыя зоркі айчыннага спорту — алімпійскія чэмпіёны, пераможцы чэмпіянатаў сьвету і Эўропы. Пасьля іх пайшла юная зьмена — пераможцы «Скураных мячоў» і «Залатых шайбаў».

У парадзе ўдзельнічалі хакеісты, у форме і з клюшкамі, толькі замест канькоў яны былі абутыя ў ролікі. На роліках таксама ехалі і лыжнікі. Скакалі коні, плылі яхты.

Людзі на хадулях і ў яясных балахонах увасаблялі сабой шахматныя фігуры. У паветры лёталі парашутысты зь дзяржаўнымі сьцягамі. Гэта ўжо троху нагадвала казкі Люіса Кэрала.

Студэнты ўнівэрсытэту фізычнай культуры ўтварылі гіганцкую жывую «Беларускую вазу».

Ніякага бляску і энэргіі ў вачох удзельнікаў параду не было і блізка.

Пасьля ад «імя ўдзячнага народу» чатыры атлетычныя хлопцы ўручылі прэзыдэнту здаровы кошык з кветкамі. І кіраўніка дзяржавы зь дзяўчынкай на руках, упрыгожанай чырвона-зялёнымі бантамі, мы таксама дзесьці ўжо бачылі.

Адным з пунктаў тэатралізаванага прадстаўленьня быў абрад «Беларускае вясельле». Побач з маладымі і іхнымі бацькамі выйшлі народныя калектывы, якія засьпявалі беларускія песьні, нешта кшталту: «Ой, запрагай-ка, бацька, лошадзь шэрую-кудлатую».

Беларускасьці Лукашэнкава ўлада паранейшаму адводзіць месца ў фальклёры, з абавязковымі лапцямі і нацыянальнымі строямі.

Афіцыйная частка сьвяткаваньня скончылася сьпевамі малавядомых выканаўцаў. Пяялі старыя савецкія гіты пра «я ў бабушкі жыву» і «галубой вагон».

Паводле падлікаў прадстаўнікоў МУС, на сьвяткаваньне прыйшло звыш 200 тысяч чалавек.

**Зьміцер Панкавец**

# Чавэс і Лукашэнка хочуць кіраваць яшчэ 20 гадоў



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Пасьля Масквы, дзе яго сустрэлі даволі холадна, прэзыдэнт Вэнэсуэлы **Уга Чавэс** у кампаніі сваіх сына, дачкі і ўнукаў пабываў у Беларусі.

Погляды Беларусі і Вэнэсуэлы на цяперашняе сьветаўладкаваньне абсалютна ідэнтычныя, заявіў Аляксандар Лукашэнка, адкрываючы 29 чэрвеня сустрэчу з Чавэсам. «Гэта — надзейная аснова для супрацоўніцтва і падтрымкі на міжнароднай арэне», — сказаў Лукашэнка.

Беларусь чакае ад Вэнэсуэлы дазволу на льготнае карыстаньне нафтавымі радовішчамі.

У сваю чаргу У.Чавэс не хаваў, што мэта яго візыту ў Расею і Беларусь — закупкі зброі: «Трэба адолець шмат перашкодаў, асабліва праз тыя сілы, якія супраць нас. Імпэрыя, якая нас назвала дыктатарамі, сама спрабуе ўстанавіць сусьветную дыктатуру».

Чавэс абяцаў Беларусі нафтавую падтрымку. «Калі мы за год столькі зрабілі, то колькі мы зробім за тыя 20 гадоў, якія нам яшчэ застаюцца ва ўладзе!» — сказаў ён. Лукашэнка адрэагаваў на гэта: «Не пужай амэрыканцаў».

Чавэс запрашаў і Пуціна, і Лукашэнку зьвяртацца на ты.

Халодны прыём у Маскве зьвязваюць з сустрэчай Пуціна з Бушам, якая мела адбыцца неўзабаве.

**МБ**

# Нарвэгія агітуе Польшчу інвэставаць у здабычу газу ў Барэнцавым моры

Прэм’ер-міністар Нарвэгіі Енс Столтэнбэрг падчас свайго візыту ў Польшчу агітаваў польскі бок інвэставаць у газавыя радовішчы.

Міністар эканомікі Польшчы Пётар Возьняк, які ўдзельнічаў у пятніцу ў спатканьні ў «вузкім коле» прэм’ераў Качыньскага і Столтэнбэрга, сказаў, што значная частка гутаркі тычылася энэргетычных пытаньняў.

Нарвэгія мае вялікія радовішчы газу. Дывэрсыфікацыя крыніцаў энэргіі — важны кірунак польскай палітыкі.

Колькі дзён таму прадстаўнікі польскай кампаніі PGNiG далучыліся да кансорцыюму Skanled, які налічвае 15 кампаніяў (паміж якімі Statoil, E.On., Ruhrgaz) і мае на мэце пабудаваць газаправод з радовішчаў у Паўночным і Нарвэскім моры, у тым ліку з радовішчаў на шэльфе, якія купіла PGNiG. Кампанія атрымала 15% удзелаў у кансорцыюме Skanled.

Skanled будзе праходзіць уздоўж паўднёвага ўзьбярэжжа Нарвэгіі. Пасьля ўзьнікненьня газаправоду Baltic Pipe газ з дацкай сыстэмы можа транспартавацца на польскае ўзьбярэжжа.

«Прэм’ер Столтэнбэрг пераконваў нас інвэставаць у радовішчы ў Барэнцавым моры. Аднак, улічваючы пануючыя там вельмі цяжкія ўмовы, гэта гіганцкія выдаткі — у 10 разоў большыя, чым па шэльфе», — сказаў Возьняк.

Міністар сумняецца, каб польскі манапаліст — кампанія PGNiG — магла ў дадзены момант выдаткаваць дадатковыя грошы, улічваючы абавязкі, зьвязаныя з набыцьцём радовішчаў па шэльфе, праектам будаўніцтва тэрміналу LNG, уваходам у кансорцыюм Skanled. Кампанія мусіць выдаткаваць на гэтыя інвэстыцыі да 2015 г. $7 млрд.

**Вольга Данішэвіч**
**паводле gazeta.pl**

# У Менску зьявіліся мікраараён Брылевічы і вуліца Ігнатоўскага

Большасьць новых назваў ушаноўваюць дзеячоў беларускай культуры. Жэстам прымірэньня з Польшчай выглядае зьяўленьне ў сталіцы Беларусі вуліцы Гедройца.

29 чэрвеня дэпутаты Менгарсавету на 4-й сэсіі прынялі рашэньне прысвоіць назвы дзесяці вуліцам Менску.

Жыламу мікраараёну Дружба-1,2,3, што будуецца на паўднёвым захадзе сталіцы, будзе дадзена найменьне Брылевічы-1,2,3. Гэта па назьве фальварку Брылевічы, вядомага па дакумэнтах XVI ст. Новаму мікраараёну каля Масюкоўшчыны даецца назва Дамброўка-3,4,5.

Вуліцам у гэтых раёнах даюць назвы вядомых беларускіх дзеячоў або знаных ураджэнцаў Беларусі. У Брылевічах вуліцы будуць насіць назвы: Яна Чачота, Каралінская, Напалеона Орды, Ежы Гедройца.

Ян Чачот быў адным з удзельнікаў антырасейскага студэнцкага руху XIX ст., а пасьля праславіўся як пісьменьнік. Напалеон Орда — мастак, кампазытар, навуковец XIX ст., які, нібы тытаны эпохі Адраджэньня, паядноўваў у сабе самыя розныя таленты. Магчыма, ён адначасова быў адным з каардынатараў нацыянальна-вызвольнага паўстаньня.

У Дамброўцы пралягуць вуліцы Ўладзіслава Галубка, Язэпа Жыновіча, Усевалада Ігнатоўскага, Алеся Гаруна і імя сужэнства Аладавых.

Тэатрал Галубок і першы кіраўнік Акадэміі навук Беларусі Іваноўскі загінулі ад рук сталіністаў. Імя паэта і рэвалюцыянэра Гаруна, які пасьля вяртаньня з царскай высылкі актыўна ўдзельнічаў у стварэньні вайсковых фармаваньняў Беларускай Народнай Рэспублікі, было ў савецкія часы пад забаронай аж да 1980-х гадоў. Жыновіч (сапраўднае прозьвішча Жыдовіч) заслужыўся зборам беларускай песеннай спадчыны.

Вулічку Свабоды на Ўсходзе пераймянуюць у вуліцу Зьмітра Гвішыяні, па імені курсанта-героя, які загінуў, гасячы пажар у цягніку.

Жэстам прымірэньня з Польшчай выглядае зьяўленьне ў сталіцы Беларусі вуліцы імя Ежы Гедройца. Народжаны ў Менску, Гедройц быў вялікім польскім інтэлектуалам XX стагодзьдзя, рэдактарам часопіса «Культура». Ён адным зь першых у польскім незалежным грамадзтве заклікаў адмовіцца ад прэтэнзій на Горадню і падтрымаць беларускі нацыянальны рух.

**Мікола Бугай**



**Грамадзкасьць працягвае пратэставаць супраць пераробкі кляштару бэрнардынаў у сталіцы пад гатэль і забаўляльны комплекс. На мінулым тыдні група каталіцкіх актывістаў выказалася за стварэньне ў сьценах былога манастыру каталіцкае сэмінарыі. На фота: пакуль комплекс былога кляштару можа наведаць кожны. Такім ён застаўся пасьля вайскоўцаў, якія выкарыстоўвалі яго ў XX стагодзьдзі.**

## Беларускі ліцэй выехаў на сэсію ў Польшчу

Навучэнцы незарэгістраванага Гуманітарнага ліцэю імя Якуба Коласа выехалі ў Польшчу. Там у іх 45 дзён будзе доўжыцца летняя сэсія. Спачатку яны будуць вучыцца ў курортным мястэчку Закапанэ, потым іх чакаюць у Гданьску і Варшаве. Сярод вучняў — тры дзясяткі навічкоў, залічаных сёлета.

У першы дзень перабываньня Ліцэю ўрачысты прыём у Варшаве ім зладзілі актывісты Клюбу каталіцкай інтэлігенцыі.

**МБ**

# А пра Ганцавічы забыліся

На перамовах Мартынава й Лаўрова бакі кляліся ў вернасьці саюзнай дамове.


PHOTO.BYMEDIA.NET

Беларусь лічыць, што ў разьмяшчэньні элемэнтаў сыстэмы проціракетнай абароны (ПРА) ЗША ва Ўсходняй Эўропе няма патрэбы. Аб гэтым заявіў журналістам міністар замежных спраў Беларусі **Сяргей Мартынаў (на фота справа)** пасьля сустрэчы ў пашыраным складзе зь міністрам замежных справаў Расеі Сяргеем Лаўровым.

Візыт кіраўніка расейскага замежнапалітычнага ведамства быў прымеркаваны да 15-годзьдзя дыпляматычных адносінаў паміж дзьвюма краінамі.

С.Мартынаў выказаў спадзяваньне, што «тымі, хто прасоўвае гэтыя рашэньні, у канчатковым выніку будзе занята разумная пазыцыя, і захадаў, якія парушаюць стратэгічную стабільнасьць, зроблена ня будзе».

С.Мартынаў паведаміў таксама, што падчас сустрэчы з расейскай дэлегацыяй бакі «пацьвердзілі зацікаўленасьць абедзьвюх краін у глыбокай інтэграцыі на аснове краевугольнага дакумэнту — дамовы ад 1999 году аб саюзнай дзяржаве».

Міністар замежных справаў Беларусі таксама падзякаваў кіраўніцтву расейскага МЗС «за вялікую дапамогу, якую консульскія работнікі Расеі аказваюць у абароне інтарэсаў беларускіх грамадзян у краінах, дзе няма нашых дыпляматычных прадстаўніцтваў».

Што датычыцца міжнароднай тэматыкі, то ў дзьвюх краін, паводле слоў С.Мартынава, «пазыцыі амаль цалкам супадаюць».

Крытыкуючы амэрыканска-польскачэскую сыстэму ПРА, расейцы ня згадваюць пра ўласную радарную станцыю пад Баранавічамі, якая выконвае тыя самыя мэты.

**МБ; інф.БЕЛТА**

# Устаноўчы зьезд «Белай Русі» адбудзецца ўвосені

У Аргкамітэт увайшлі прадстаўнікі ўсіх сацыяльных групаў.

Зварот Аргкамітэту па стварэньні арганізацыі апублікаваны дзяржаўным агенцтвам БелТА 2 ліпеня па абедзе, на расейскай мове.

Зварот Аргкамітэту падпісалі 60 асобаў. Сярод іх два старшыні аблвыканкамаў — Паўлаў і Крупец, адзін міністар — адукацыі, Радзькоў, сьпевакі Дарафеева і Афанасьева, спартоўцы Ціхан і Несьцярэнка, акадэмік Бабосаў, кампазытар Лучанок, а таксама масава рэктары ВНУ і дырэктары заводаў.

Сярод падпісантаў кіраўнік БРСМ, але няма Козіка. Затое прысутнічаюць Азаронак і Чаргінец.

Мяркуючы па сьпісе падпісантаў, аб'яднаньне, якое празываюць таксама Партыяй Аляксандра Лукашэнкі, стане справай усенароднай.

У аргкамітэце, як водзіцца, удзельнічаюць адзін мэханізатар (з СПК «Савецкая Беларусь»), адзін наладчык (з МТЗ), адна настаўніца (біялёгіі). Затое аж тры артысты-вакалісты, плюс адзін дырыжор, плюс Анатоль Ярмоленка. Спартоўцаў таксама трое.

Банкіры Надзея Ермакова і Пятро Пракаповіч суседнічаюць з кіраўніком «Зьнешэканомбанку» Георгіем Ягоравым.

У сьпісе адсутнічаюць прадстаўнікі сілавых структураў, якія ўваходзілі ў кіраўніцтва КПСС на роўных з цывільнымі. Ці то лукашэнкаўская канцэпцыя грамадзянскае супольнасьці ставіць сілавікоў па-над ёю, ці то стварэньнем «Белай Русі» займаюцца прадстаўнікі лібэральнае плыні ўнутры лукашэнкаўскай адміністрацыі.

Імаверна, асобныя прадстаўнікі намэнклятуры ад удзелу ў «Белай Русі» адмаўляліся. Іначай цяжка патлумачыць, чаму адны ўнівэрсытэты прадстаўленыя рэктарамі, а, напрыклад, Берасьцейскі — першым прарэктарам.

**Мікола Бугай**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Менск. 3 ліпеня.**

# 73 працэнты абітурыентаў выбралі беларускую мову



PHOTO.BYMEDIA.NET

Нягледзячы на перавод выкладаньня гісторыі на расейскую мову, здаваць гісторыю па-беларуску мове пажадала 27 500 чалавек з 37 700 абітурыентаў.

Максымум, які змаглі набраць абітурыенты на тэставаньні па гісторыі Беларусі, — гэта 97 тэставых балаў. З 34,5 тысячы ўдзельнікаў цэнтралізаванага тэставаньня такой колькасьцю балаў могуць пахваліцца 2 чалавекі. Па адным абітурыенце набралі 95 і 96 тэставых балаў. Сярод іх, як высьветлілася на сайце «НН», ёсьць прынамсі адзін чытач нашай газэты. Віншуем!

Нягледзячы на перавод выкладаньня гісторыі Беларусі на расейскую мову, здаваць па-беларуску пажадала пераважная большасьць абітурыентаў (27 490 чалавек з 37 717).

Біялёгію здавалі 45 тыс. абітурыентаў (на беларускай мове пісалі тэсты 2600 чалавек).

Замежныя мовы — 40 тыс. чалавек. Зь іх 31 600 здавалі ангельскую мову, 6400 — нямецкую, 1800 — францускую і 300 — гішпанскую.

Зборнікі з матэрыяламі тэставаньня па ўсіх дысцыплінах і правільнымі адказамі да ўсіх заданьняў зьявяцца ў продажы яшчэ да завяршэньня тэрмінаў падачы дакумэнтаў у ВНУ другога патоку. Тэндэр на іх выпуск выйграла выдавецтва «Аверсэв».

**МБ; інф. «Звязды»**

# БДУ на 1663 месцы ў сьвеце




Існуе шмат рэйтынгаў навучальных установаў розных краін. Рэйтынг Webometrics ад гішпанскай арганізацыі Cybermetrics Lab — адзін з самых аб'ектыўных. Там галоўны крытэр — якасьць пазыцыянаваньня ВНУ ў інтэрнэце.

У першую дзясятку рэйтынгу ўвайшлі толькі ўнівэрсытэты ЗША. Першым стаіць Масачусэцкі тэхналягічны інстытут. За ім ідуць Стэнфард, Гарвард, Бэрклі, Пэнсыльванскі і Мічыганскі ўнівэрсытэты.

Толькі на 19-м месцы брытанскі Кембрыдж, а на 32-м — Швайцарскі фэдэральны тэхналягічны інстытут.

Найлепшы ў Афрыцы — унівэрсытэт Кейптаўну, у Азіі — Сынгапуру.

Сярод 500 найлепшых — 238 ВНУ з ЗША і Канады, 211 — з Эўропы, 21 — Аўстраліі і Акіяніі, 20 азіяцкіх, 9 з Лацінскай Амэрыкі і толькі 1 афрыканскі ўнівэрсытэт.

Маскоўскі дзяржаўны ўнівэрсытэт знаходзіцца на 232 месцы.

Варшаўскі ўнівэрсытэт тэхналёгіяў займае пазыцыю 508.

Віленскі ўнівэрсытэт і Ўнівэрсытэт Латвіі знаходзяцца на 587 і 922 радках.

Толькі ўкраінскія ВНУ крыху прайграюць беларускім, Унівэрсытэт імя Тараса Шаўчэнкі знаходзіцца пасьля БДУ.

Ніводзін іншы беларускі ўнівэрсытэт ня трапіў у сьпіс 3000. Найбліжэйшыя па рэйтынгу Гарадзенскі і Гомельскі дзяржаўныя ўнівэрсытэты займаюць 3161 і 4514 месцы адпаведна.

**АК; Generation.by**

## СЬЦІСЛА

### Дзень нецьвярозасьці

Кіраўнік сталіцы Міхаіл Паўлаў загадаў не абмяжоўваць гандаль алькаголем 3 ліпеня. Адначасова супрацоўнікам міліцыі загадана не чапаць захмялелых грамадзянаў. «Нават калі чалавек і выпіў лішняга, гэта наш грамадзянін, і ніхто нікому не даваў права прыніжаць яго гонар і годнасьць», — падкрэсьліў старшыня Менгарвыканкаму. Забараніць продаж сьпіртнога 3 ліпеня пасьля 18-й гадзіны прапаноўвала міліцыя. Аднак Паўлаў пажадаў аргкамітэту зладзіць такое сьвяткаваньне, каб людзі без усялякіх абмежаваньняў забыліся на алькаголь.

### Віцебск пазбыўся сярпа й молата

28 чэрвеня на плошчы Свабоды ў Віцебску дэмантавалі стэлу зь сярпом і молатам. Яна прастаяла ў цэнтры гораду некалькі дзесяцігодзьдзяў. На месцы стэлы Віцебская япархія мае паставіць памятны крыж пра зруйнаваны Сьвята-Мікалаеўскі сабор.

### Горадня пратэстуе

6 ліпеня адбудзецца сход ініцыятыўнай групы па правядзеньні гарадзкога рэфэрэндуму супраць рэканструкцыі гістарычнага цэнтру Горадні. Пра гэта паведаміў адзін з ініцыятараў мерапрыемства Вадзім Саранчукоў. Група налічвае больш за 150 чалавек. Набор у яе працягваецца. Працягваецца і рэканструкцыя гораду. Усьлед за польскай брукаванкай адзіную пешаходную ў горадзе вуліцу Савецкую вызваляюць ад дрэваў.

### Мілінкевіч сустрэўся з пасламі Эўразьвязу

2 ліпеня ў Варшаве Аляксандар Мілінкевіч сустрэўся з кіраўнікамі дыпляматычных місій краінаў Эўразьвязу, якія знаходзяцца ў Польшчы, а таксама з арганізатарамі стыпэндыяльнай праграмы імя Кастуся Каліноўскага. А.Мілінкевіч падкрэсьліў неабходнасьць далучэньня ўсіх краінаў Эўразьвязу да гэтай праграмы.

**Сямён Печанко**

# Мэнтальная прорва

Калі на ўрачыстым сходзе 2 ліпеня, і на парадзе Лукашэнка прамаўляў на мове краіны, зь якой паўгоду таму Беларусь вяла нафтагазавую вайну. Піша **Аляксандар Класкоўскі**.

Калі пры канцы чэрвеня сайт прэзыдэнта займеў беларускамоўную вэрсію, пайшлі размовы: ну, мусіць, наверсе вырашылі актыўней гуляць на ніве нацыянальнай ідэі! Хто-кольвек казаў: калі на 3 ліпеня афіцыйны лідэр будзе прамаўляць па-беларуску, то гэта ўжо можна лічыць мэсэджам.

Варта дадаць, што асобныя маскоўскія палітолягі даўно прарочылі: рана ці позна Лукашэнка цалкам авалодае нацыяналістычнай рыторыкай, створыць ідэйны антырасейскі альянс з «радыкальнай апазыцыяй» — і Беларусь канчаткова сыйдзе з зоны ўплыву Масквы.

Аднак і на ўрачыстым сходзе 2 ліпеня, і на парадзе Лукашэнка прамаўляў на мове краіны, зь якой паўгода таму Беларусь вяла нафтагазавую вайну.

(Аналіз зьместу вынесем за дужкі, адзначыўшы адной фразай, што сьпічрайтэры пашчыравалі, бы для пленуму ЦК КПСС часоў халоднай вайны.)

Карацей, як маскоўскія палітолягі, так і дамарослыя рамантыкі (ці прагматыкі?) яднаньня з уладай могуць адпачываць.

Дарэчы, нядаўняе сацыялягічнае апытаньне засьведчыла: толькі 29,7% суграмадзянаў лічаць, што кіраўнік краіны мусіць заўжды прамаўляць па-беларуску. Болей за траціну (34,3%) мяркуюць, што гэта не абавязкова, і амаль столькі ж (34,1%) — што мове тытульнай нацыі варта аддаваць даніну час ад часу.

Перад афіцыйным сьвятам незалежнасьці аб'яднаныя дэмакраты без асаблівага імпэту заклікалі адзначыць дату разам з уладай. Пра кансалідацыю прамаўлялася і з высокіх трыбунаў. Але з абодвух бакоў гэта былі рытуальныя фразы. Фармат сьвяткаваньня — ад урачыстага сходу да спажываньня беляшоў зь півам — не прыстасаваны да праяў палітычнага плюралізму. Улада ж бачыць згуртаваньне нацыі выключна пад сьцягам казённай ідэалёгіі. Яна нават выдае жаданае за існае, кажучы, што «беларускі народ ёсьць адзіным ды зьядналым».

Але, як ні парадаксальна, толькі ў тым разе, калі з высокіх трыбунаў перастануць казаць пра «адзіны ды зьяднаны народ», зьявіцца шанец на кансалідацыю.

«Адзіны народ» — гэта міт з таталітарным адценьнем. Насамрэч у разьвітым грамадзтве мусяць быць розныя ідэалёгіі, розныя партыі і грамадзкія арганізацыі, каб адлюстроўваць інтарэсы асобных сацыяльных групаў. Калі гэта будзе прызнана «наверсе», тады і адчыніцца шлях да кансалідацыі, да грамадзкага дыялёгу. Мудрасьць улады палягае ў тым, каб не баяцца разнастайнасьці, даваць абсяг для разьвіцьця грамадзянскай супольнасьці. Бо інакш у варунках крызы можа адбыцца сацыяльны катаклізм.

На жаль, сюжэт з паўстаньнем «Белай Русі» паказвае, што кіроўныя вярхі трымаюцца імітацыйнага шляху. Хочуць стварыць бутафорыю замест грамадзянскай супольнасьці. І такім чынам рызыкуюць наступіць на старыя савецкія граблі.

Што ж да прагнозаў маскоўскіх палітолягаў пра альянс Лукашэнкі з нацыяналістамі, то гэта з разраду імпэрскіх фобіяў. Бо нават пры тактычным супадзеньні пазыцый у пытаньні незалежнасьці — між афіцыйным кіраўніком і апазыцыяй застаецца мэнтальная, сьветапоглядная прорва.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Беларусь зачыніць бюро радыё «Свабода»?

Беларусь не баіцца эканамічных санкцый з боку ЗША і ў выпадку іх увядзеньня гатовая зрабіць захады ў адказ, заявіў у панядзелак Аляксандар Лукашэнка, выступаючы на сходзе з нагоды Дня вызваленьня Беларусі. «Мы прадпрымем жастачайшыя меры ў адносінах прадпрыемстваў і калектываў, якія працуюць на тэрыторыі Беларусі з боку Злучаных Штатаў Амэрыкі», — сказаў А.Лукашэнка.

Няясна, да каго адносіцца гэтая пагроза. Амэрыканскіх «прадпрыемстваў» у Беларусі ня так і шмат. Да такіх могуць быць аднесеныя «Кока-Кола», «Макдональдз», ці яшчэ «Дэтройт брэвінг», які валодае Бабруйскім броварам.

Пасьля масавага закрыцьця прадстаўніцтваў амэрыканскіх фундацый, нямнога засталося і «калектываў». Да гэтай катэгорыі можна аднесьці хіба што бюро радыё «Свабода» і, з нацяжкай, дыпляматычнае прадстаўніцтва.

На ЗША прыходзіцца зусім малая доля замежнага гандлю Беларусі, таму эканамічныя санкцыі з боку Вашынгтону будуць мець ня столькі фінансавае, колькі палітычнае значэньне.

**Мікола Бугай**

# «Коммерсант»: Беларусі прадыктавалі ўмовы атрыманьня расейскага крэдыту

На перамовах Фрадкова зь Сідорскім 29 чэрвеня Расея выставіла новыя патрабаваньні.

На перамовах з прэм’ерам Беларусі Сяргеем Сідорскім 29 чэрвеня расейскі бок выставіў новыя ўмовы атрыманьня дзяржаўнага крэдыту ад Расеі, піша інфармаваная расейская газэта «Коммерсант».

Беларусы ўзьнялі запытаную суму з $1,5 млрд да $2 млрд. Сідорскі абгрунтоўваў патрэбу ў крэдыце стратамі беларускай эканомікі ад росту цэнаў на нафту й газ.

Расейскі бок выставіў у якасьці ўмоваў выдзяленьня крэдыту зьмяншэньне выдаткаў бюджэту — так, каб гэты крэдыт стаў апошнім, каб краіна была здольная разьлічыцца па ім у будучыні.

Аднак за гэтым патрабаваньнем, піша «Коммерсант», стаіць іншае. Расея патрабуе ад Беларусі прыватызацыі прыбытковых прадпрыемстваў. Расейцаў, якія ўжо атрымалі «Белтрансгаз» і шэраг перапрацоўчых прадпрыемстваў, цяпер цікавяць «Нафтан», Мазырскі НПЗ, «Палімір», «Белшына», «Гродназот», «Беларуськалій».

Расейскі прэм’ер Міхаіл Фрадкоў рэзюмаваў перамовы заявай, што магчымасьць крэдытаваньня Беларусі «разглядаецца», але «гэта патрабуе пэўнага часу і ўважлівага стаўленьня». Тэрмін наступных перамоваў не называецца.



**Сяргей Сідорскі (на фота справа) спрабаваў вытаргаваць саступкі.**

**Мікола Бугай**

# Дэфіцыт гандлёвага балянсу дасягнуў мільярда даляраў

Такі вынік першых чатырох месяцаў гэтага году. Пра гэта заявіў на супольным паседжаньні палатаў парлямэнту віцэ-прэм’ер Віктар Бура. Ён канстатаваў, што адʼемнае сальда расьце за кошт прамежкавага і энэргетычнага імпарту, а таксама інвэстыцыйнага і спажывецкага.

Віктар Бура зазначыў, што вырашальным быў уплыў гандлю энэргетычнымі таварамі. Экспарт нафтапрадуктаў зьнізіўся за 4 месяцы на $205,1 млн, а экспарт беларускай нафты зусім не ажыцьцяўляўся. «Агульныя страты экспарту па гэтых двух таварах склалі $430 млн».

Агульны кошт імпарту нафты зьнізіўся на $237 млн празь зьніжэньне фізычных абʼёмаў. У той жа час пастаўкі газу ўзрасьлі на $359 млн праз рост цэнаў на яго.

У выніку за 4 месяцы адʼемнае сальда па гандлі таварамі дасягнула $1,2 млрд. Але яго ўдалося на траціну кампэнсаваць за кошт гандлю паслугамі.

Якія прагнозы? «Многае будзе залежаць ад вырашэньня пытаньня паставак нафты, экспарту нафтапрадуктаў, загрузкі нафтаперапрацоўчых заводаў», — дадаў В. Бура.

**МБ; інф. БЕЛТА**

## СЬЦІСЛА

### Скачок квартплаты будзе ў 2008 годзе

Мінэканомікі лічыць магчымым павысіць у 2008 г. аплату жыльлёва-камунальных паслуг для насельніцтва на велічыню, блізкую да 20 даляраў у разьліку на стандартную 2-пакаёвую кватэру. Сёлета прырост цэн абмежаваўся пяцьцю далярамі. Хоць многія могуць з гэтым паспрачацца.

### Зьніжаецца стаўка рэфінансаваньня

Зь 1 ліпеня стаўка рэфінансаваньня паменшае на 0,25% — да 10,75% гадавых. Гэта першая зьмена стаўкі ад 1 лютага.

### «Санта Брэмар» будуе міні-электрастанцыю

Рэзыдэнт свабоднай эканамічнай зоны «Берасьце» СП «Санта Брэмар» мае ў 2008 г. збудаваць уласную мініэлектрастанцыю. Газатурбінны блёк аўстрыйскай вытворчасьці мае на 10—15% зьнізіць сабекошт энэргарэсурсаў для прадпрыемства. Кошт праекту — 1,5 млн эўра. Выканаць яго «Санта Брэмар» зьбіраецца за ўласныя сродкі.
СП «Санта Брэмар» — гэта буйны вытворца рыбнае прадукцыі. У 2006 годзе яго абʼём вытворчасьці склаў $176 млн. Сёлета рост вытворчасьці складае 30%. 65% прадукцыі ідзе на экспарт.

### Суша пашкодзіла 10% зерневых

Найбольш пацярпелі Гомельшчына, дзе недабор ураджаю зерня складзе прыкладна 0,2 млн тонаў, і Меншчына.

**МБ; БЕЛТА; Сямён Печанко**

# Як скажа Філарэт

Праваслаўны сьвятар **а. Аляксандар Шрамко** чакае рашэньня мітрапаліта Філарэта наконт дазволу адпраўляць службы.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

15 траўня мітрапаліт Філарэт падпісаў указ аб забароне праводзіць службы клірыку Сьвята-Пакроўскага прыходу Менску Аляксандру Шрамку і залічыў яго па-за штат. У віну а.Аляксандру паставілі ўдзел у канфэрэнцыі па пытаньнях свабоды сумленьня. А.Шрамко тады крытыкаваў адпаведны закон, і ягоная пазыцыя супярэчыць пазыцыі БПЦ.

Адзінай магчымасьцю ізноў вярнуцца да сьвятарскай дзейнасьці зьяўлялася напісаньне пакаяннага ліста Філарэту. І сапраўды, дзесьці праз тыдзень сьвятар напісаў такі ліст, але адказу няма па сёньня. Айцец Аляксандар кажа: «Надзея на добры фінал яшчэ не прапала канчаткова».

Мітрапаліт абяцаў запрасіць сьвятара да сябе на гутарку, але зь нейкіх прычын яна ўвесь час адкладалася. У чэрвені ўладыка Філарэт шмат езьдзіць па краіне. У Менску зьявіцца толькі ў пачатку ліпеня.

Сьвятар вырашыў, калі справа станоўча ня вырашыцца, то будзе працаваць у сфэры журналістыкі.

Цяпер у праваслаўную япархію накіроўваецца шмат лістоў у знак салідарнасьці з Шрамком. Пішуць ня толькі зь Беларусі, але і з Францыі, Бэльгіі. У прыходзе да сьвятара ставяцца прыхільна, у тым ліку і настаяцель. Шрамко кажа пра тое, што цяпер досыць часта яго спыняюць на вуліцы, каб выказаць сваю падтрымку.

Дарэчы, 4 ліпеня а. Аляксандру споўнілася 50 гадоў.

**Зьміцер Панкавец**

**28 чэрвеня**

**Фінькевіча ў Шклоў**

Адміністрацыя магілёўскай камэндатуры, дзе адбывае пакараньне **Артур Фінькевіч**, вырашыла пакуль не выносіць хлопцу чарговага папярэджаньня. Яго меліся вынесьці за інцыдэнт, які адбыўся 25 чэрвеня, калі хлопец пасьля адбою выйшаў у суседні пакой па валідол. Фінькевіча пакаралі дадатковымі працамі па прыборцы тэрыторыі. Калі б папярэджаньне было вынесенае, яно аказалася б чацьвертым, і Артур мог адправіцца адбываць пакараньне ў калёнію. Цяпер Артур працуе ў вёсцы Рэчкі (Шклоўскага раёну) на будоўлях агракамбінату «Зара».

**Дашкевічу адмовілі**

**Зьміцер Дашкевіч** паведаміў сваім сябрам у лісьце, што яму адмовілі ў датэрміновым вызваленьні. Камісія па ўмоўна-датэрміновым вызваленьні адмовіла вязьню за «шэраг спагнаньняў за парушэньні рэжыму дня і формы адзеньня». Адначасова палітвязьня выклікалі на допыт па справе **Івана Шылы**.



WWW.SVABODA.ORG

**«Я — дрэва. Зрэжце мяне». Флэш-моб у Горадні ў абарону традыцыйнага гарадзкога ляндшафту.**

**2 ліпеня**

**Затрымалі ў Будславе**

У Будславе, дзе праходзіла штогадовая пілігрымка, за збор подпісаў былі затрыманыя 14 актывістаў Кампаніі за зьмену закону пра свабоду сумленьня. Затрыманыя мясцовай міліцыяй ды супрацоўнікамі КДБ па Менску і Менскай вобласьці актывісты правялі каля трох гадзінаў у Будслаўскім РУУС. Міліцыянты сканфіскавалі каля 500 асобнікаў «Весьніка» Кампаніі ў абарону права на свабоду сумленьня. На аднаго з каардынатараў Кампаніі **Сяргея Луканіна** быў складзены пратакол.

**Азарка вывесіла**

**Насту Азарка** затрымалі а 23-й гадзіне пасьля таго, як яна паспрабавала вывесіць бел-чырвона-белы сьцяг побач зь Нясьвіскім райвыканкамам. Яе пратрымалі ў пастарунку ноч і адпусьцілі а 12-й. Быў складзены пратакол аб адміністратыўным парушэньні.

**3 ліпеня**

**Затрыманьні моладзі БНФ**

А 15-й гадзіне быў затрыманы лідэр моладзі Партыі БНФ **Алесь Каліта**, які спрабаваў дапамагчы вырвацца зь міліцэйскага атачэньня актывістцы **Насьці Александровіч**.

**Затрымалі абаронцаў Горадні**

6 актывістаў руху ў абарону гістарычнай спадчыны Горадні затрымалі на вул. Савецкай. Сярод затрыманых былі **Алесь Залеўскі**, **Франак Вячорка**, **Вікторыя Волкава**, **Сяргей Кулік**, **Аляксандар Мілінец**, **Віталь Ізотаў**, **Мікола Жукоўскі**. За распаўсюд улётак затрымалі **Алену Дыяніну**. Моладзь трымала расьцяжку і дзіцячыя цацкі: рыдлёўкі ды экскаватар. Рыхтаваўся пэрформанс. Ад 30 чэрвеня ў Горадні ладзіцца летнік «Гарадзенская фартэцыя». Яго ўдзельнікі займаюцца распаўсюдам інфармацыі пра ход рэканструкцыі Старога гораду, дзяжураць побач з будынкамі, заплянаванымі пад знос.

**Хадэкаў трасуць**

На кватэры сябраў ініцыятывы «Беларускія хрысьціянскія дэмакраты» па вуліцы Пушкіна ў сталіцы адбыўсяператрус. Супрацоўнікі КДБ і міліцыі заявілі, што забяруць з сабой для праверкі кампутары і ўсе носьбіты інфармацыі. У кватэры таксама былі бланкі для збору подпісаў за зьмену Закону аб рэлігіі.

# Янычары XXI стагодзьдзя

Нататкі на палях тэлепраграмы. Юбілейны тыдзень Янкі Купалы ў камэнтары **Віталя Тараса**.

У Віцебску адбудзецца адкрыцьцё чарговага «Славянскага базару». Як заўжды, відовішча будзе трансьлявацца на ўсю краіну, а таксама на Расею як важная культурніцкая падзея. Цяжка сказаць, ці будзе падчас грандыёзнага шоў хаця б згаданае імя Янкі Купалы, 125-годзьдзе з дня народзінаў якога адзначаецца 7 ліпеня. У гэты дзень у праграме віцебскага фэстывалю пазначаны гала-канцэрт майстроў беларускай культуры «Ад роднае зямлі, ад гоману бароў…» (Радок зь Якуба Коласа). У праграме, як звычайна — Анжаліка Агурбаш, Ірына Дарафеева, Паліна Смолава, Ксеня Сітнік — і г.д., паводле сьпісу.

Сам факт, што юбілей будзе адзначаны не канцэртам, адмыслова прысьвечаным Купалу, але «Славянскім базарам», падаецца красамоўным.

## Пустое сэрца

Апошнім часам зрабілася агульным месцам, амаль штампам, сьцьверджаньне пра тое, што сёньняшняя ўлада працягвае традыцыі колішняй савецкай палітыкі, у тым ліку культурніцкай. Што Беларусь ператвараецца, ці ўжо ператварылася, у свайго роду заказьнік, у якім закансэрваваныя традыцыі й звычаі былога СССР. Да падтрыманьня гэтага стэрэатыпу спрычыніўся, паміж іншымі, і аўтар гэтых радкоў у сваім нядаўнім артыкуле ў «НН».

Але практыка апошніх год у галіне культурніцкай палітыкі (калі яе можна так назваць) дае падставы думаць, што Беларусь сутыкнулася не з паўтарэньнем пройдзенага, а зь нейкім вычварным экспэрымэнтам. Экспэрымэнтам, аналяг якога цяжка знайсьці ў сучаснай гісторыі.

Праўда, можна ўспомніць янычараў. У Асманскай імпэрыі янычараў вырошчвалі з хрысьціянскіх юнакоў, захопленых у палон і павернутых у іслам. Часьцей за ўсё гэта былі прадстаўнікі славянскіх народаў (баўгары й сэрбы) — высокія, русявыя, з блакітнымі вачыма. Гэта таксама быў свайго роду экспэрымэнт. Не было больш надзейных і бязьлітасных ваяроў у турэцкім войску, як янычары. Ва ўкраінскай мове янычарамі дагэтуль называюць рэнэгатаў, якія верна і ўпарта служылі чужой уладзе, лютых карнікаў. Але варта заўважыць, што, апрача вайсковага мастацтва, сапраўдныя янычары вывучалі каліграфію, права, тэалёгію, літаратуру і замежныя мовы.

Зьвернемся да больш блізкага часу. Клясыкі беларускай літаратуры, увогуле беларуская культура (хаця б яе частка) былі ўбудаваныя ў савецкую ідэалёгію БССР. Стагодзьдзе Купалы і Коласа адзначаліся ў Беларусі надзвычай шырока, у прыватнасьці, на самым высокім афіцыйным узроўні. Так, многіх магла не задавальняць форма юбілейных мерапрыемстваў — акадэмічная, нават пампэзная. Большасьць тагачасных юбілеяў клясыкаў — у тым ліку жывых — звычайна зводзіліся, найперш, да стварэньня ганаровага прэзыдыюму, які засядаў на сцэне на тле партрэту юбіляра і лічбаў: 70, 75, 100. Даўгія прамовы афіцыйных дакладчыкаў не прадугледжвалі палемікі альбо пытаньняў з залі. Дый самі даклады праходзілі папярэднюю цэнзуру на прадмет выкараненьня магчымай крамолы з тэкстаў — напрыклад, «няправільнага прачытаньня» клясыкаў. Так, усё гэта было. Але ўсё гэта не адмяняе таго факту, што беларускай клясыцы надавалася агромністае значэньне.

Віктар Казько ў сваім эсэ «Зазірнуць у вочы свайму я», фрагмэнты якога апублікаваныя ў газэце «Новы час» за 2-8 ліпеня, піша: «Ці было яшчэ ў якой-небудзь краіне ў якія-небудзь часы, каб творчая эліта амаль цалкам ішла ў апазыцыю, як цалкам пайшоў Саюз пісьменьнікаў? І якія імёны, якія постаці. Сама культура пайшла ў апазыцыю да ўлады. А што ўлада? Калі губляеш тое, пра што ня ведаеш, то і не баліць галава аб страчаным, нішто яе ня тлуміць: «Пустое сэрца б’ецца роўна».

## Параход сучаснасьці

Найбольш важным падаецца ня тое, што культура пайшла ў апазыцыю. Такое здаралася ў гісторыі розных народаў. Але такога, каб уладная эліта ня толькі была бескультурнай, але ўвогуле лічыла нацыянальную культуру непатрэбнай — тут аналёгіі сапраўды знайсьці цяжка.

Як вядома, ленінскі ўрад выслаў з Расеі славуты «параход філёзафаў» — многіх знакамітых дзеячоў мастацтва, літаратуры й навукі аднойчы проста пагрузілі на карабель і выправілі за мяжу. Ленін, аднак, цудоўна разумеў цану гэтым людзям (хоць і называў іх «г… нацыі»). Таму й вырашыў выслаць, што баяўся — людзі з высокім інтэлектам і ўзроўнем культуры могуць прычыніць шкоду хамскай уладзе. Рашэньне, як высьветлілася, уратавала жыцьцё гэтым людзям і прынесла дадатковую славу краінам, якія іх прытулілі.

Але тых, хто пасьля рэвалюцыі скідваў Пушкіна з «парахода сучаснасьці» (як пралеткультаўцы), саміх даволі хутка скінулі з «п’едэсталу». А Пушкін, Талстой, Тургенеў, Чэхаў засталіся запатрабаванымі і ў Савецкім Саюзе.

Сталін ня толькі ведаў, але тонка адчуваў літаратуру — у тым ліку сучасную паэзію і драматургію. Што не перашкаджала яму цкаваць і нават зьнішчаць выбітных літаратараў разам зь сем’ямі. Вядома, аднак, і іншае. Імя Міхаіла Булгакава, напрыклад, хоць і было зьнятае з тэатральных афішаў, спэктакаль паводле ягонай п’есы «Дні Турбіных» («Белая гвардыя») няспынна йшоў на сцэне галоўнага драмтэатру краіны. Сталін не аднойчы сам таемна прыходзіў паглядзець пастаноўку. (На думку некаторых літаратуразнаўцаў, ён нават запазычыў словы аднаго з галоўных герояў п’есы ў сваім знакамітым звароце напачатку вайны: «Братья и сестры! К вам обращаюсь я…»).

Вядомы факт тэлефанаваньня Сталіна Пастэрнаку. Тут гаворка не пра зьмест тых тэлефонных размоваў. Гаворка пра сам факт, які немагчыма нават уявіць у сучаснай Беларусі.

**Працяг на старонцы 12.**

# Янычары XXI стагодзьдзя

Працяг са старонкі 11.

Вядомая фраза Гёбэльса — калі я чую слова культура, хапаюся за пісталет. Вядома й тое, што амаль усе выдатныя пісьменьнікі й мастакі эміґравалі з нацыстоўскай Нямеччыны. Але гітлерскія ўлады прыкладалі намаганьні, каб угаварыць дзеячоў культуры застацца, схіліць іх на свой бок. Зразумела, гэта ня тычылася габрэяў. Кнігі габрэйскіх аўтараў палілі, сярод іншых, на вогнішчах. Але цікавы факт: славуты верш Генрыха Гайнэ «Лярэлея» ў Трэцім райху заставаўся ва ўсіх хрэстаматыях — праўда, з пазнакаю «народная песьня». Нацыстам не прыходзіла да галавы скарачаць гадзіны нямецкай мовы ў школах альбо выкладаць гісторыю на мове якой-небудзь іншай дзяржавы.

Няможна ўявіць і выказваньняў фюрэра наконт «вершаў» Мана, альбо накшталт таго, што, скажам, Гутэнбэрг жыў у XVIII стагодзьдзі ў Празе.

## Славянскі базар forever

У сучаснай Расеі літаратура й мастацтва перажываюць сёньня ня лепшы час. Дастаткова паглядзець расейскія тэлеканалы. Тым ня менш, у Расеі існуюць шматлікія літаратурныя часопісы, адчыняюцца новыя. Існуе шмат літаратурных, тэатральных і кінапрэміяў, галоўным чынам недзяржаўных. Выходзіць безьліч новых кнігаў, у тым ліку паэтычных, узьнікаюць новыя імёны. З маладымі літаратарамі, у тым ліку — зь людзьмі апазыцыйных ці, прынамсі, нонканфармісцкіх поглядаў сустракаецца Пуцін. Можна лічыць гэта часткай піяр-кампаніі расейскага прэзыдэнта. Можна назваць ягоную ініцыятыву абвясьціць 2007 год годам расейскай мовы прапагандысцкай акцыяй. Але чаму б кіраўніку суседняй дзяржавы, які апошнім часам імкнецца падкрэсьліць самастойнасьць і сувэрэннасьць сваёй палітыкі, не перахапіць ініцыятыву ды не абвесьціць Год беларускай мовы ў Беларусі?

Многія памятаюць сустрэчу кіраўніка дзяржавы з прадстаўнікамі тады яшчэ адзінага Саюзу пісьменьнікаў. І што беларускія пісьменьнікі пачулі ад найвышэйшай асобы? Што ў сучаснай беларускай літаратуры няма твораў, вартых апублікаваньня. Вось калі зьявяцца — тады дзяржава іх падтрымае. Ня ўсе зразумелі тады, што публічная зьнявага была нанесеная ня толькі пісьменьнікам — літаратуры ў цэлым. А тым самым і беларускаму народу, які нібыта ня мае літаратуры, вартай саноўнай увагі. Ды і як народ можа мець годную літаратуру, калі мова, на якой яна ствараецца, не заслужыла, каб ёю размаўляла чынавенства, у тым ліку дзяржаўнае кіраўніцтва? Калі ўвесь час падкрэсьліваецца другаснасьць беларускай мовы ў дачыненьні да расейскай, а беларусы абвяшчаюцца «палепшаным варыянтам» расейцаў? Так бы мовіць, юбэрмэнш, толькі з расейскім акцэнтам.

Ды каб расейская мова й культура былі

> Беларусь перажывае экспэрымэнт, аналяг якога цяжка знайсьці ў сучаснай гісторыі.




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

сапраўднымі прыярытэтамі сучаснай палітыкі ў Беларусі — гэта была б яшчэ палова няшчасьця. Ці шмат мы бачым апошнім часам на тэлеэкранах расейскай ці сусьветнай клясыкі? Ці шмат паказваюць фільмаў паводле Пушкіна, Талстога, Дастаеўскага, ці перадач, прысьвечаных іх творчасьці? Ці пакажа, цікава, хоць адзін тэлеканал у Беларусі сэрыял «Запавет Леніна» паводле «Калымскіх апавяданьняў» Варлама Шаламава пра ГУЛАГ? (Маштаб і глыбіня таленту гэтага пісьменьніка, 100-годзьдзе якога нядаўна шырока адзначалася ў Расеі, на думку многіх, не саступае маштабу Салжаніцына.)

Расейскі канал «Культура», на якім можна пабачыць даволі шмат цікавых культурніцкіх праграмаў, у Беларусі даўно ня йдзе — ён стаў непатрэбным, як і культура беларуская. Замест яе людзям навязваецца эрзац-культура ў выглядзе суцэльнай папсы й пячорнага гумару «Комэдзі клаб».

## Поўны эрзац

Сёлета 6 ліпеня 1-ы нацыянальны (!) канал 125-годзьдзю Купалы прысьвячае фільм Юр'я Цьвяткова (цяперашняга старшыні Саюзу кінэматаграфістаў) «После ярмарки». З усіх магчымых варыянтаў выбіраецца савецкая карціна 1970-х гадоў на расейскай мове, пастаўленая паводле матываў (!) знакамітай «Паўлінкі». (Няўжо не засталося ніводнага відэазапісу тэатральных пастановак, напрыклад, Купалаўскага тэатру?) Фільм ідзе ў пятніцу апоўдні. Адразу за ім — дакумэнтальная стужка «Янка Купала». І на гэтым усё.

Галоўнае месца ў эфіры (прайм-тайм) на юбілейным тыдні займаюць «Славянскі базар» ды «Маёр Ветраў» паводле Мікалая Чаргінца. На канале «Лад» у выходныя дні — спрэс футбол і бокс.

Як казаў некалі адзін дыплямат, «у Англіі ня будзе рэвалюцыі, пакуль там ёсьць футбол». Ангельскіх «фанаў», аднак, ніхто не прымушае сьпяваць брытанскі гімн на стадыёнах — яны пяюць яго самі, са сваёй ахвоты, а не па камандзе, раз на год, у 21:50 у дзень афіцыйнага дзяржаўнага сьвята.

Што тычыцца дзяржаўнага гімну РБ, дык варта нагадаць, што Ўладзімер Карызна — толькі суаўтар тэксту. Словы гімну БССР, пакладзенага ў аснову цяперашняга, напісаў у 1930-я гады Міхась Клімковіч. Але нядаўна давялося пабачыць на БТ інтэрвію з Уладзімерам Карызнам, які падрабязна распавядаў пра тое, зь якім творчым натхненьнем ён працаваў над тэкстам. Толькі вось свайго папярэдніка суаўтар згадаць забыў. І справа тут ня толькі ў асабістых амбіцыях паэта. Такое ўражаньне, што ўсе сябры новасьпечанага СП на чале з Чаргінцом абсалютна сьвята вераць у тое, што гісторыя літаратуры пачынаецца зь іх. Не са Скарыны, не з Багушэвіча, не з Багдановіча, не з Купалы й Коласа, а менавіта зь іх. Як было шчыра заяўлена ўсяму сьвету ў адным з інтэрвію кіраўніка памянёнага саюзу, у яго ўвайшлі ўсе найбольш выдатныя пісьменьнікі сучаснасьці. Усе — ні больш і ні менш. Перайначыўшы вядомую фразу расейскага клясыка, плынь літаратуры спынілася. Амаль паводле Фукуямы.

Ад сёньняшняга дня літаратураю павінны лічыцца толькі й выключна «вострасюжэтныя творы» Чаргінца, тэксты Ўладзімера Карызны, вершы Аўруціна.

Хутка ў новага СП зьявіцца свая друкарня. Вось ужо тады, напэўна, беларускі народ натоліць сваю прагу да прыгожага пісьменства. Толькі чамусьці здаецца, што ня ўбачым мы чэргаў за бэстсэлерамі Чаргінца ды ягоных таварышаў па літаратурным цэху. Пісьменьнікаў не прызначаюць, імі становяцца. Альбо не становяцца. Датацыю дзяржавы на свае кніжкі атрымаць можна, ахвотных купіць іх не знайсьці – вось дзе праблема.

## Няма таго, што раньш было

Хтосьці членаў новага Саюзу, відаць, падмануў. Альбо ім самім падалося, што можна, як за ранейшым часам, займаючы высокае палажэньне ў кіраўніцтве творчай арганізацыі, выдаваць і перавыдаваць свае кніжкі — шматтомнымі выданьнямі ды масавымі накладамі. Ды яшчэ атрымліваць за гэта дзяржаўныя прэміі, дзяржаўныя дачы, мець службовую машыну, «вяртушку» і сакратарку, якая прыносіць табе ў кабінэт шклянку чаю на падносе, накрытую белай сурвэткай. (От жа ж гэтая мара пра шклянку чаю! Асабіста ведаю аднаго журналіста самых лібэральных і дэмакратычных поглядаў, які, атрымаўшы пэўную пасаду, ня змог адмовіць сабе ў задавальненьні займець такую сакратарку.)

Нехта з абраных — дакладней, набліжаных да высокай асобы, можа быць, усё гэта атрымае. Але страшэнна вузкае кола гэтых літаратурных ахоўнікаў рэжыму, страшэнна далёкія яны ад народу. І ад начальства.

Стратэгічная памылка гэтых людзей, якая становіцца ўсё больш відавочнай, палягае на перабольшанай ацэнцы ўласнай значнасьці, а таксама значнасьці сваёй прафэсіі ў вачох сёньняшняй улады. Ім здавалася, што калі яны адолеюць супастата — няверны ўладзе Саюз беларускіх пісьменьнікаў, — дык за гэта будуць узнагароджаныя. Што іх асыплюць з галавы да ног знакамі пашаны ды матэрыяльнымі шчадротамі, амыюць сьлязьмі замілаваньня. А начальства нічым асаблівым не аддзячыла. Ну, адабралі ў старога Саюзу пісьменьнікаў Дом літаратара, дом творчасьці «Іслач», ліквідавалі Літфонд. А шчасьця ў адданых уладзе пісьменьнікаў усё адно няма. Прынамсі, Дом літаратара Адміністрацыя прэзыдэнта нікому аддаваць не зьбіраецца.

З усіх мастацтваў начальства важнейшымі, па-ранейшаму, лічыць тэлебачаньне і кіно. (Толькі дзе яно, тое беларускае кіно — няўжо Заміталін і кампанія яго створаць?) А яшчэ — візуальнае аздабленьне дзяржаўных сьвятаў альбо «базараў». Ну і маляваньне глямурных фотапартрэтаў, канечне. А да пісьменьнікаў начальства ставіцца ў лепшым выпадку як да абслугі. Абслужыў і — «пшел вон!»

Дый нешта не відаць сярод прэтэндэнтаў на званьне новых сталпоў дзяржаўнай літаратуры асобаў, блізкіх па маштабе сакратарам колішняга Саюзу пісьменьнікаў — Броўку, Мележу, Танку, Шамякіну. Колькі б ні ўставалі прэтэндэнты на дыбачкі — не відаць. І выпуск у сэрыі ЖЗЛ біяграфіяў сёньняшніх літаратурных чыноўнікаў не ўратуе іх ад хуткага забыцьця.

Гісторыя літаратуры не пачалася з СПБ і на ім ня скончыцца. Рана ці позна гісторыя ўсё расставіць па сваіх месцах. І нашыя нашчадкі дадуць сваю ацэнку ня толькі героям афіцыйнай ЖЗЛ, але ўсім нам. Ад нас залежыць, каб нашы дзеці ды ўнукі не выраслі янычарамі. Ці экспэрымэнт па раскультурваньні нацыі ўжо завяршыўся посьпехам?

# Цяжар пустаты

П'еса пра Купалу паводле Караткевіча. Прэм'ера спэктаклю «Сны аб Беларусі» сабрала ў Купалаўскім тэатры аншлягі 28 і 29 чэрвеня. Піша **Андрэй Скурко**.

На афішы, побач з пазнакай аб юбілейнай сутнасьці спэктаклю, стаіць імя Ўладзімера Караткевіча. Пастаноўка заяўленая як фантазія па матывах п'есы «Калыска чатырох чараўніц». Караткевіч напісаў яе ў 1981-м, і на 100-гадовы юбілей Купалы яе давалі ў Тэатры юнага гледача.

Фантазія адвольная. Так, у фінале Караткевічавай п'есы малады Купала чытае «Мужыка»: чытач нібы прысутнічае на нараджэньні паэта. Спэктакль «па матывах» завязаны на Купалавай сьмерці.

Рэжысэр Уладзімер Савіцкі ставіў задачу пазбавіць Купалу «прыземленасьці», паказаць яго «касьмічнасьць» і «асучасьніць».

Дзеля гэтага У.Савіцкі ўвёў у п'есу цытаты з Купалавых «касьмічных» паэмаў «Адвечная песьня», «Сон на кургане», «На Куцьцю», урыўкі з розных твораў Караткевіча. Прыдумаў сцэну ў гатэлі «Масква». Працытаваў стэнаграму допыту Купалы ў НКВД. І тое-сёе падрэзаў у п'есе.

Напрыклад, палічыў несучаснымі і выдаліў вобразы паніча Казіка — разбэшчанага маладога нуварыша, які можа «ўсё купіць»; праўдашукальніка Стафана Каляды; аматара панскай культуры аконама.

Пазьнікалі і клясычныя цытаты, якімі тэкст Караткевіча сочыцца: з Мацея Бурачка, з Каліноўскага. Урывак з «Мужыцкай праўды» («...не народ зроблены для ронду, а ронд для народу. А ў нас, дзецюкі, чы гэтак?») заменены на пачатак «Ліста з-пад шыбеніцы», ізноў жа прэпараваны — зьніклі «маскалі». Лішне казаць пра верш «Гэта енк, гэта крык, што жыве Беларусь!», які быў у арыгінале.

У сюжэтных правалах, якія ўтварыліся пасьля выманьня з п'есы пэрсанажаў і сцэнаў, буяе містыка — уласна, сны. Сьняцца, у асноўным, энэргічныя скокі русалак з вадзянікамі (ці хто гэтыя напаўаголеныя маладыя людзі?). Пасьля трэцяга зьяўленьня яны падаюцца навязьлівымі. Нават сур'ёзныя ўрыўкі з паэмы «На Куцьцю» чытаюцца на фоне купальскіх русальных любошчаў. Нібы не ў Купалы юбілей, а, напрыклад, у Сержпутоўскага.

Сцэны ў гатэлі «Масква», дзе фігуруюць па-чаргінцоўску адпрасаваныя энкавэдысты з пакаёўкамі, не такія зацяганыя асацыятыўна. Але пытаньне «навошта», якое ўзьнікае пасьля чарговага выхаду русалак, не пакідае і тут. Бо энкавэдысты, паводле сэнсу, тыя ж русалкі. Так купальская папараць, якой афармленая сцэна, пры іншым асьвятленьні ператвараецца ў гатэльныя фікусы. Ну, дапытвалі Купалу ў НКВД, ну, сапраўды, маглі яго забіць у Маскве. Але такое можна было ставіць і ў годзе 1990-м. А ў тэатар жа йдзеш пабачыць ня жыцьцяпіс пэўнага дацкага прынца, а знакі сёньняшняга дня ў гісторыі Гамлета. Калі ж соль страціць моц, дык чым асоліш яе?

І акторы адчуваюць гэтую сэнсавую неданапоўненасьць. Бяруць крыкам там, дзе не стае зьместу, ня знаюць меры ні ў сьмеху, ні ў сьлёзах. Бяруць брутальнасьцю (чаго вартая песьня «Быў у бабкі казёл...») бяз дай прычыны. Ад гэтага выпіраюць другасныя лініі. Губляецца зьместавая гіерархія. Што сёньняшняму гледачу да сагнаных у пачатку XX стагодзьдзя зь зямлі арандатараў? Хіба гісторыкі ды жыхары Зымбабвэ (там Мугабэ зараз такім займаецца) прачуюць гэты канфлікт. У п'есе Караткевіча той канфлікт важны для разуменьня ўмоваў жыцьця Купалавай сям'і. На ім будуюцца важнейшыя для аўтара рэчы. У пастаноўцы ж ён, узмоцнены яшчэ цытатамі з «Раскіданага гнязда», павісае ў паветры.

Зусім юбілейная была б пастаноўка, каб не юбіляр. Уявіце: з сцэны зьнікае ўсё другаснае, «туманная машына» працуе на поўную моц, і з гэтага туману, з глыбіні выходзіць, накульгваючы, сапраўдны Янка Купала. Па сьпіне мурашкі.

Гэтага вобразу таксама няма ў тэксьце. Рэжысэрская прыдумка. Купала ўзору 1942 году. Стомлены зламаны чалавек, які ўжо ўсё напісаў — і геніяльныя паэмы, і ліст вялікаму Сталіну ад беларускага народу.

Але ён зьяўляецца — і пустоты пачынаюць іграць. Яны дэтануюць з вобразам *такога* Купалы. І дзіўна мяняюцца ролі: раптоўна ў пэрсанажа ператвараецца сам рэжысэр. Ён маецца на ўвазе. Ён быў змушаны рэдагаваць тэкст менавіта так, пакідаючы менавіта гэтыя пустоты, замяняючы менавіта гэтыя ўрыўкі. Час вадзіў яго рукой. «Сны...» — нібыта помнік часу, калі тое, пра што адкрыта можна было казаць у 1981-м, ператваралася ў намёкі, а рэчы, ясныя ў 1991-м, — у намёкі на намёкі. Пастаноўка дажыве роўна да канца гэтага часу. А потым разбурыцца, праваліцца сама ў сябе, ня вытрымаўшы цяжару пустаты.

А мо п'есу проста рыхтавалі да прыезду Уга Чавэса? Ён русалак ацаніў бы дакладна.



# Вяртаньне да Буйніцкага

Беларускія тэатры зьбіраюцца перавесьці на самаакупнасьць.

У тэатральных колах гэтая інфармацыя прайшла ў канцы чэрвеня. Пытаньне найбліжэйшым часам мае вырашыцца на калегіі Мінкульту. Пакуль няма афіцыйнага рашэньня, кіраўніцтва тэатраў ад камэнтароў устрымліваецца.

Перавод на самаакупнасьць можа прывесьці да скарачэньня штатаў і заробкаў. Гэтак, у маладэчанскім тэатры «Батлейка» працуе 50 чалавек. Заробкі ў іх перавышаюць 500 тыс. рублёў. Болей атрымліваюць толькі ў міліцыі, банках або ў Менску.

Чым тэатры будуць зарабляць на жыцьцё, невядома. Ёсьць г.зв. «камэрцыйныя тэатры». Адзін з такіх існуе пры маладэчанскім Палацы культуры чыгуначнікаў. Але займаюцца ўсім, што дае прыбытак.

Цэны на квіткі ў Маладэчне асабліва ня ўздымеш. Таму тэатры і вымагаюць падтрымкі дзяржавы ці прыватных фундатараў.

Ёсьць і яшчэ адзін варыянт: адкруціць кола часу і вярнуцца на стагодзьдзе назад. У пачатку XX ст. тэатар Ігната Буйніцкага вандраваў ад вёскі да вёскі, даючы спэктаклі. Так зьезьдзілі ўсю Беларусь.

І цяпер карысьць для вяскоўцаў будзе несумненная, у многія паселішчы артысты не зазіралі ніколі. Вось толькі што зарабіць шмат супрацоўнікі тэатраў ня здолеюць. Народ у вёсцы не багаты.

**Сяргей Рак**

## СЬЦІСЛА



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

### Вольскі рыхтуе сольны альбом

Выступаючы на фэстывалі «Месяц аўтарскага чытаньня» ў Брно (Чэхія), беларускі сьпявак расказаў пра свой новы, сольны альбом. «Гэта будзе кабарэ-альбом сатырычных песень, — расказаў Лявон Вольскі карэспандэнту радыё «Свабода». — Ён выйдзе напачатку верасьня. Назву ня буду казаць, бо яна ня тое што нецэнзурная, але даволі-такі небясьпечная».

### У Горадні адкрылі помнік Жылібэру

У Горадні 3 ліпеня быў адкрыты помнік Жану Эмануэлю Жылібэру (1741—1814). Францускі навуковец і мэдык узначаліў у Горадні каралеўскую мэдычную акадэмію, пабудаваную тагачасным рэфарматарам Антоніем Тызэнгаўзам.

Помнік усталяваны на ўваходзе ў парк імя Жылібэра, дзе ён пры канцы XVIII ст. заснаваў батанічны сад. Помнік пастаўлены паміж дзьвюма камяніцамі, збудаванымі Тызэнгаўзам — лямусам, у якім цяпер рэстарацыя, і тэатрам, што захаваўся ў перабудаваным выглядзе. Глыбей у парку захавалася таксама трохпавярховая камяніца былой мэдычнай акадэміі.



WWW.SVABODA.ORG

Аўтар помніка — скульптар Уладзімер Панцялееў. Ён сказаў, што задаволены тым, што праца нарэшце пастаўленая, але вельмі стомлены. Паводле яго словаў, гарадзенцы ня вельмі абазнаныя ў гісторыі роднага гораду: мінакі ня могуць адрозьніць Жылібэра ад Суворава ці, нават Пятра I.

### Выйшаў новы альбом «Чырвоным па Белым»

«Крывавы Сакавік» — гэта 20 новых трэкаў, вынік гадавой працы. Тэксты на розныя тэмы, ад выраслай колькасьці ўдзельнікаў гурту — чатырох МС (Krou, Realize, Zeman, Jaycop). Гурт «Чырвоным па Белым» выступае ад 2004 году і стаў самым вядомым беларускамоўным рэп-гуртом. Набыць альбом можна ў крамах «Містэрыі Гуку» або праз незалежных распаўсюднікаў.

**МБ, радыё «Свабода»**

# Босы дойлід

У Менску стала на адзін помнік болей.



Аўтар, вядома ж, Уладзімер Жбанаў. Усьлед за помнікамі паштальёну, фатографу й гандлярцы семкамі скульптар ушанаваў сваім творам памяць пра дойлідаў, якія зрабілі Менск. Гэта падарунак фірмы «Элема» гораду.

Эскіз скульптуры Жбанаў зрабіў літаральна за тыдзень. І ціха, бяз шуму ўсталявалі проста на галоўнай плошчы сталіцы, што на сьвятле завецца Незалежнасьці, а пад зямлёю — Леніна.

Цяпер навюткі помнік ужо стаіць каля старасьвецкага будынку, у якім месьціцца Камітэт архітэктуры і горадабудаўніцтва гарвыканкаму. І зь ім у абдымку цяпер ахвотна фатаграфуюцца разьзявакі. Скульптура ўяўляе сабою прэтэнцыёзную кампазыцыю ў выглядзе барадатага чалавека са скруткам пад пахаю. Ён чаруе над будовамі, што сымбалізуюць архітэктуру Менску розных эпохаў.

**Сярей Харэўскі, фота аўтара**

# Будслаўскі фэст сабраў тысячы вернікаў

Пілігрымы прынесьлі з сабой 500–гадовы драўляны крыж. Кульмінацыяй урачыстасьцяў стала начная працэсія па Будславе.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

У нядзелю, у дзень пачатку фэсту, задажджыла. Гэты дзень стаў найцяжэйшым для шматлікіх пілігрымаў, якія выправіліся пакланіцца Маці Божай Будслаўскай з розных канцоў краіны — Жодзіна, Віцебску, Браслава, Маладэчна. Пілігрымка з Баранавічаў, напрыклад, ішла дванаццаць дзён.

Пробашч менскага Чырвонага касьцёлу Уладзіслаў Завальнюк узначаліў пілігрымку на байдарках па рэках Вяльлі і Сэрвачы зь Вільні. З сабой яны везьлі 500-гадовы вялікі драўляны крыж. Ён быў выраблены з той самай драўніны, якая 500 гадоў таму сплавам па Сэрвачы й Вяльлі была дастаўлена з Будслава ў Вільню для ўзьвядзеньня кляштару бэрнардынаў. Цяпер вернікі будуць пакланяцца гістарычнаму крыжу.

Зь Менску ў пяцідзённую пілігрымку выйшлі 380 паломнікаў. Сярод іх ня толькі каталікі, але й праваслаўныя, пратэстанты, уніяты. Пілігрымаў цёпла сустракалі ў прыдарожных вёсках — бралі да сябе на ноч, кармілі, нават рабілі лазьню.

З сталічнымі пілігрымамі ішоў праваслаўны манах зь Пецярбургу, а таксама цемнаскуры хлопец з Брытаніі. Яны спэцыяльна прыехалі ў Беларусь дзеля знакамітае пілігрымкі. Шмат людзей далучалася да пілігрымаў па дарозе.

Як заўсёды, шматлікай была дэлегацыя Віцебскай дыяцэзіі. Усяго зь Менска-Магілёўскай архідыяцэзіі і Пінскай дыяцэзіі пешшу прыйшлі ды сьвятыні 1 509 вернікаў, зь Віцебскай дыяцэзіі — 1 511 пілігрымаў.

Кожная дэлегацыя мела свае апазнавальныя рысы. На сталічных пілігрымах былі жоўтыя хусьцінкі, баранавіцкія мелі сінія, маладэчанцы трымалі ў руках жоўтыя сланечнікі.

Пілігрымы пачалі падыходзіць у Будслаў пасьля абеду. Па традыцыі, яны найперш кіраваліся да сьвятыні. Многія прапаўзалі гэты апошні адцінак шляху на каленях. Пасьля чаго разьбівалі намётавыя мястэчкі практычна ва ўсіх кутках Будслава.

**Працяг на старонцы 19.**

**Хай людзі ўбачаць Вашымі вачыма:**

зьмясьціце на nn.by Вашы фоты і інфармацыю з Будслава і кожнай іншай падзеі: web@nn.by, 29–707–73–29, 29–613–32–32, 17–284–73–29.

# Дзякуй

**Міхасю Т.** са Слуцку.

**Пятру Б., В.А., Паўлу Д.** зь Берасьця.

**Івану М.** з Маладэчна.

**Алене М.** зь Бярозаўскага раёну.

**Івану Д.** зь Мядзельскага раёну.

**Сяргею Д.** зь Лідзкага раёну.

**Андрэю К., Віктару Дз., Юр'ю Г., Сяргею К., Івану Р., Хрысьціне М.** з Горадні.

**Васілю А., Анатолю Б.** з Магілёва.

**Валеру Ш.** з Круглянскага раёну.

**Яўгеніі Я., Тацьцяне Г.** з Гомеля.

**Раісе Д., Анатолю П.** з Салігорску.

**Руслану Р.** з Баранавічаў.

**Юліі Е.** з Наваградзкага раёну.

**Аляксандру Н.** са Жлобіна.

**І.І.** са Смалявіцкага раёну.

**Лявону Л.** з Астравецкага раёну.

**Віктару Л.** з Калінкавіцкага раёну.

**Івану Я., Мікалаю Л., Аляксандру Ф.,Анатолю С., Васілю Б., Лідзіі Т., Сьвятлане Р., Генадзю П., Т.А., В.П., Н.П., С.С., Уладзімеру С., Зьмітру С., Уладзімеру С., Р.А., В.М., Уладзімеру З., А.А., А.П., Веры С., Людміле М., Галіне Т., Аляксандру Ш., Марыі Н., Натальлі С., К.П., Тамары М., Л.В., В.В., Зьмітру М., А.І., П.П., Т.П., Вячаславу Р., Э.Н., Кастусю Л., Юр'ю М., Надзеі С., А.Б., Юр'ю Б., Уладзімеру К., Андрэю В., Валянціну Л., А.В., Е.Е., Міхаілу З., В.А., Арсеню Л., Ігару Я., Леаніду Л., Валянціне Дз., Алене С., Алене П., Вікенцію С., І.П., Адаму З., Ігару М., Яўгену Л., Сяргею С.** зь Менску.



**Дар'я Каткоўская і яе сын Алесь разносяць газэту «Наша Ніва» ў Сухараве. Калі і Вы хочаце разносіць газэту, зьвяжыцеся з Рэдакцыяй. dastauka@tut.by, 29-260-78-32, 29-618-54-84, 17-284-73-29**

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

**дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.**

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@tut.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

Па пытаньнях атрыманьня газэты пытайцеся Рамана.

## Як выконваецца дырэктыва №3 у Смалявічах

Ужо больш за два тыдні ня сьвецяцца ліхтары па ўсім горадзе. Апроч вывесак прадпрыемстваў. На маёй вуліцы Жодзінскай гарыць толькі адная вывеска «Белдзяржстраху».

**Яўген Пугач, Смалявічы**

## Узорны горад Пінск

**Нядаўна па радыё пачуў шакуючую навіну: у Пінску будзе зьнесены шэраг дамоў у цэнтры гораду, каб спраставаць транзытную вуліцу.** Ня даў веры. Празь некалькі дзён прачытаў пра гэта ў «НН».

Пачалі руйнаваць Горадню, і тут раптам — Пінск. Што гэта? Натуральна, што гэта не выпадковасьць, адчуваецца нейкая заканамернасьць. Складаецца ўражаньне, што ідзе ціхая, неаб'яўленая вайна зь Беларусьсю. Ідзе зачыстка тэрыторыі, вызваленьне яе ад рэштак беларуска-ліцьвінскай мінуўшчыны, якіх і так засталося вобмаль. Прычым пасьпешна, па ўсёй краіне, і грошы на гэта знаходзяцца.

Бо як іначай гэта разумець? Ці не было б больш рацыянальным зрабіць адвод транзытнага транспарту з цэнтру гораду на ўскраіну? Аднак не. Спачатку тую ж самую транзытную вуліцу ператварылі ў тупік, перакрыўшы яе пачварным будынкам ГДК. А цяпер вырашылі адвесьці ўбок за кошт старых дамкоў. А можа, лепей зруйнаваць гэтую гаргару ГДК? А што, бурыць дык бурыць! І адсяляць нікога ня трэба.

Месяц таму я гуляў па гэтым кавалку вуліцы з гасьцямі з Польшчы. Гэта якраз адрэзак вуліцы ад гістарычнага цэнтру да доміка Рышарда Капусьцінскага. І тады я пачуў ад маіх гасьцей, што тут няма духу, але... калі б тут былі кавяранькі, бары, крамкі, то, можа, тады адчулася б жыцьцё.

Тут яшчэ захаваліся падворкі, па якіх, напэўна, гойсала дзятва ў часы маленства Рышарда Капусьцінскага, пра што ён апісвае ў сваёй кнізе «Імпэрыя». І яны таксама маглі б стацца аб'ектам зацікаўленасьці для турыстаў — аматараў творчасьці вялікага рэпарцёра. Але гораду часоў Рышарда ня будзе. Засталося падарваць калегіюм і зьнесьці касьцёл разам з сэмінарыяй (а што яны там цацку сабе зрабілі!) — і тады Пінск стане ўзорным сучасным *белорусскім* горадам, з пустынным заасфальтаваным пляцдармам, зручным для транспарту, замест гэтых развалюх.

**Пінчук**



**Падобныя дамкі і падворкі стваралі своеасаблівую, утульную атмасфэру старога Пінску, што заўсёды падкрэсьлівалі госьці гораду.**

## Чаму ў Горадні паміраюць дрэвы

— Ах, якія прыгожыя, далікатныя гэтыя сястрычкі Ліпы! — не пераставалі захапляцца шляхетныя Каштаны на вуліцы Ажэшкі, пазіраючы на юных суседак. А іх пляменьнікі, маладыя Каштаны, што жылі праз дарогу, былі безнадзейна закаханыя ў прыгажуняў-сясьцёр. Яны ж, і насамрэч, красуні, былі заўсёды сумнымі, бо не маглі адвесьці вачэй ад ганаровых Ясакараў, што вылучаліся нетутэйшым хараством між іншых дрэваў і здаўна жылі ля Гараднічанкі ў сквэры Жылібэра. А тыя, нібы Нарцыс з антычнага міту, былі закаханымі толькі ў сябе.

Няшчасьце прыйшло нечакана.
Няшчасьце прынесьлі людзі.

Загудзелі, заскрыгаталі пілы, прагна ўпіліся ў жывыя, такія дасканала прыгожыя целы. З глухім гулам упалі Ясакары, зашапацеўшы галінамі. Іх вочы ўпершыню глянулі ў вочы маладзенькіх Ліпаў, угледзелі ў іх тое, чаго ніколі ня зьведалі ў жыцьці, — вялікае, шчырае, пяшчотнае каханьне, якое не памірае, бо як жа ня верыць Караткевічу: ён ведаў пра каханьне ўсё:

Калі памірае каханьне…
Але каханьне не памірае.
Яно вечна застаецца ў грудзях
лікуючай тугою слоў,
Безнадзейным болем
і непатольнай пяшчотай,
Калі нічым не дапаможаш,
хаця сэрца аб зоры разьбі.

Каханьне не памірае. Паміраюць ад каханьня. Крывавым болем напоўніліся сэрцы маладых Ліпаў. Надоўга перажылі яны сваіх каханых. Прастаялі змрочную гарадзенскую зіму, застыўшы ў скрусе, каб так і не прачнуцца вясною, засталіся хмурнымі і чорнымі. І маладыя Каштаны, якія ўжо пачалі былі выпускаць да жыцьця са сваіх галінаў зялёныя лісточкі, засохлі ад нечаканай страты…

Чорныя-чорныя дрэвы, што цягнуць у неба мёртвыя галіны на вуліцы Ажэшкі ў Гародні, — гэта ахвяры страчанага каханьня, гэта і папрок людзкой жорсткасьці. Іх пакуль ня сьсеклі. Людзі занятыя іншым вынішчэньнем…

**Ала Петрушкевіч, Горадня**

## Докшыцы: на магіле пабудуюць аўтастаянку?

**У Докшыцах сёлета плянуюць урачыста адзначыць 600-годзьдзе з даты першай узгадкі пра паселішча.** Да падзеі прымеркаваныя работы па добраўпарадкаваньні цэнтру. Сярод плянаў — перанос аўтастаянкі з пляцоўкі перад райвыканкамам у сквэр паміж вуліцай Піянэрскай і агароджай Сьвята-Пакроўскай царквы.

Гэта зручнае месца, аднак у гэтым сквэры знаходзіцца магіла старшыні валаснога рэвалюцыйнага камітэту Ісака Ванта, ваеннага камісара Івана Клімка і чырвонаармейскага камісара Мікалая Кузьняцова, якіх тутака расстралялі ў жніўні 1919 году.

Паляки на месцы іх магілы збудавалі помнік Пілсудзкаму. Савецкая ўлада зьнесла гэты помнік, аднак магілу не ўвекавечыла. А цяпер яе закатаюць пад асфальт.

Распавядае краязнаўца Кастусь Шыталь: «Архітэктары ня ведалі, што стаянку будуюць на магіле. Калі я пайшоў у аддзел ідэалёгіі райвыканкаму, там сказалі, што будуць разьбірацца».

**Янка Зуброўскі, в.Лапуты (Докшыцкі раён)**

## Станьма шляхтай

**Найпершая задача беларусаў — гэта адраджэньне шляхетнасьці грамадзтва.** Пачынаць трэба зь сябе. Не працаваць на рэжым; ня жыць жабраком; не падтрымліваць імітатараў змаганьня; не паддавацца любому замбаваньню, усе падзеі спакойна аналізаваць; не глядзець у рот чужынцам.

А што ж тады рабіць?

Шмат вучыцца, разьвіваць свае таленты, імкнуцца займаць ключавыя пазыцыі, асабліва ў эканамічнай сфэры, разьвіваць сябе фізычна, заваёўваць аўтарытэт сярод людзей.

Шляхецкі стан — гэта ня партыя і не грамадзкая арганізацыя, гэта шырокая сацыяльная група. У авангардзе гэтай групы павінны быць ня хітрыя спажыўцы грантаў і не пасобнікі рэжыму, а людзі з гонарам. Задача, якую павінен вырашыць авангард, — знайсьці крыніцы існаваньня для жыцьця, альтэрнатыўныя лукашэнкаўскаму рэжыму.

Апазыцыя зможа прыйсьці да ўлады, толькі калі яна будзе грунтавацца на фінансавых рэсурсах знутры краіны.

**Галіна Арцёменка (Нямеччына)**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас:**
**а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# Будслаўскі фэст сабраў тысячы вернікаў




**Працяг са старонкі 16.**

Думалася, што праз залевы — іх за дзень пранеслася над Будславам аж тры, прычым адна з градам — людзей на фэсьце будзе меней, чым летась. Дык жа не. Не зьлічыць было машын і аўтобусаў. Імі заставілі мястэчка і палеткі, якія сталі імправізаванымі паркінгамі. Кіроўцам, якія прыехалі пад ноч, прыходзілася паркавацца за некалькі кілямэтраў ад базылікі.

Пад алтаром шмат сьпявалі: па-сучаснаму, па-беларуску. Увогуле, сярод людзей было шмат беларускамоўных. Пасьля каталіцкай імшы для пілігрымаў уніяцкі хор адсьпяваў акафіст.

З кожным годам фэст аднаўляе экумэнічныя рыскі, уласьцівыя яму ў мінулых стагодзьдзях. Яго наведваюць людзі розных вызнаньняў.

Адным зь першых я сустрэў ля санктуарыю Паўла Севярынца. Ён раздаваў аўтографы. Севярынец у Будслаў прыехаў упершыню. Было відаць, што ён не чакаў убачыць такую грамаду і быў уражаны настроем фэсту.

Насупраць касьцёлу, па-над балотам, што стала пасьля дажджоў — ліўневай каналізацыі пакуль няма — стаяла чарада палатак. Там прадавалі зьнічы, абразкі, ружанцы, сувэніры. Была адна ятка ад праваслаўнага кляштару. Бойка ішоў гандаль традыцыйнымі фэставымі смактулькамі-пеўнікамі. Іх з пражанага цукру і розных фарбавальнікаў вараць тутэйшыя майстры.

З другога боку разлогае Краснае плошчы прадавалі паесьці і папіць – ад гарбаты да шашлыкоў. Зьехаліся сюды ўсе раённыя крамы спажыўкаапэрацыі, кавярні і многія прыватнікі з сваёй пярэстай драбязой.

Плошча Красная — колісь гэта значыла «прыгожая, харошая». Так, як кажуць, «Красносельле» ці «Красны Бор». На цяперашніх шыльдах, вядома плошча мянуецца «Чырвонай». Невуцтва выяўляецца. Таксама і ў нязграбным добраўпарадкаваньні Будслава, калі грошы выкідваюцца на дурніцы, — падбельваньне бардзюраў, абрэзваньне дрэваў ці пракладку дарожак у сквэры, а няма лавак, каб людзям прысесьці адпачыць і перакусіць з дарогі. Ды ўсё гэта не псуе сьвята. Найбольшага сьвята для сотняў вернікаў і, вядома, духавенства.

Ксяндзы й манашкі практычна ўсе беларускамоўныя. Шмат у каго з маладых былі бел-чырвона-белыя стужачкі, фенечкі і значкі «За Свабоду».

Ксёндз-вядоўца вітаў моладзь: «У гэты самы час у Менску адбываецца канцэрт «Акіяну Эльзы». Некаторыя з прысутных хацелі б туды трапіць, для некаторых быў складаны выбар, куды пайсьці. Але вы не пашкадуеце, што выбралі пілігрымку».

Сьвятары не вагаюцца гаварыць з амбоны на самай народнай мове — дзівоснай трасянцы. «Пацяраўся муж. Адвард Часлававіч, вас чакаюць каля бочкі са сьвянцонай вадой пад фанаром».

Дзіва што людзі губляліся. Чым меней часу заставалася да поўначы, тым болей народу сьцякалася да базылікі. Кульмінацыя фэсту — урачыстая працэсія апоўначы. Не акінуць вокам было гэтае людзкое мора. Толькі на вялікім экране, якім стаў мур базылікі, можна было пабачыць від фэсту зьверху. Праз праектар адбывалася трансьляцыя зь некалькіх камэраў. Гэтае ноў-хаў было ўжытае на фэсьце ўпершыню. Дарэчы, усе заўсёднікі фэсту адзначалі добрую арганізацыю сёлетняга збору.

За некалькі хвілін да поўначы на ўсім пляцы былога савецкага аэрадрома пачалі запальвацца сьвечкі. Нарэшце хоры касьцёлаў Сьвятой Тройцы і Яна Хрысьціцеля са сталіцы пачынаюць: «Ойча

**Працяг на старонцы 20.**

# Будслаўскі фэст сабраў тысячы вернікаў

Працяг са старонкі 19.

наш, каторы ёсьць у небе...», і працэсія зь дзясяткаў сьвятароў, якую ўзначальваюць біскупы менска-магілёўскі Антоні Дзям’янка, віцебскі Ўладзіслаў Блін і пінскі Казімір Вялікаселец, пакідае базыліку і па жывым калідоры набліжаецца да вялікага алтара, збудаванага з паўночнага боку храму. Абраз спускаецца да людзей, і рака сьвечак паволі плыве за ім з поля на плошчу, цячэ ўздоўж яе, утвараючы кілямэтровае жывое кола. У начной цішы хор сьпявае гімн Багародзіцы. Абраз ужо вяртаецца на алтар, а людзі з задніх шэрагаў яшчэ толькі пачынаюць свой ход. Відовішча заваражвае.

Паводле ацэнак сьвятароў-арганізатараў фэсту, сёлета ў Будслаў зьехалася каля 45 тысяч чалавек.

Фэст на вачах ператвараецца ў сьвята нацыянальнага маштабу. Аднак апроч другасных чыноўнікаў з камітэту па справах рэлігіяў і прадстаўнікоў райвыканкаму, ад уладаў у Будслаў ніхто не прыязджае. А на добры лад, гэткай падзеі пасавала б прысутнасьць першых асобаў дзяржавы. Дарэчы была б і жывая трансьляцыя на тэлебачаньні.

Зрэшты, адсутнасьць лішняй помпы надае фэсту пачуцьця і непасрэднасьці.

Сьвята абышлося безь вялікіх інцыдэнтаў, калі не лічыць таго, што ксёндз Уладзіслаў Завальнюк у часе пілігрымкі перакуліўся з байдаркі ў ваду. Паломнікі віталі пробашча сталічнага касьцёлу Сьвятых Сымона і Алены з асаблівай цеплынёй, як прапата, які асабліва шмат робіць для наданьня сьвяту міжнароднага характару.

У нядзелю супрацоўнікі міліцыі — яны зьехаліся на фэст з усяго раёну — затрымалі 14 зборшчыкаў подпісаў за адмену закону аб свабодзе сумленьня. Гэта былі актывісты Хрысьціянскай дэмакратыі і незарэгістраванага «Маладога фронту».

Калі ж на дзённай імшы ў панядзелак дзяўчына з Барысава Кася разгарнула бел-чырвона-белы сьцяг, ніхто ня быў супраць.

Самай жа галоўнай падзеяй сёлетняга фэсту стала закладаньне ў мястэчку паклоннай гары Маці Божай Будслаўскай. «Пакуль гэта толькі малы пагорачак зь вялікім мэталічным крыжам. На яго пілігрымы будуць складаць прынесеныя з сабой у знак пакаяньня камяні й зямлю з родных мясьцінаў. З часам гэтая гара Кальварыя і крыжовы шлях да яе стануць месцам споведзі, працэсій і службаў.

**Зьміцер Панкавец, Будслаў–Менск**

### «НН» пра Будслаўскі фэст 100 гадоў таму

21 юня (2 ліпеня па новым стылі) быў фэст. Людзей было вельмі многа. Людзі, чым купіць газэту, нясуць свае саракоўкі да манапалькі. Манаполька зарабіла каля тысячы рублёў ад мужыкоў. Было шмат стражнікаў, усё са стрэльбамі. Але нічога «падазрыцельнага» не было. Нават п’яныя не пабіліся.

**Васіль Красіва. №25. 1907**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Фін, што кіраваў Намібіяй

цяпер рыхтуе незалежнасьць Косава. Піша **Усяслаў Шатэрнік.**



У сувязі з апошнімі падзеямі вакол Косава часта даводзіцца чуць імя былога прэзыдэнта Фінляндыі Марці Ахтысаары. Хто гэты чалавек? Чаму менавіта яму даручылі заняцца косаўскай праблемай?

Марці Ойва Калеві Ахтысаары нарадзіўся 23 чэрвеня 1937 г. і сёлета будзе адзначаць сямідзесяцігодзьдзе. Бацька будучага прэзыдэнта быў афіцэрам фінскай арміі. Таму пасьля вайны сям'і Ахтысаары давялося перабрацца з Выбаргу, дзе нарадзіўся Марці і які адышоў СССР, у горад Оўле. Там ён заканчвае пэдагагічнае аддзяленьне мясцовага ўнівэрсытэту. Аднак праца ў родным Суомі яго не прывабіла. Неўзабаве настаўнік робіцца дыпляматам.

Ён прадстаўляе радзіму ў краінах Афрыкі, працуе ў ААН. Вядомасьць яму прынесла місія ў Намібію. Назва гэтай краіны была добра вядомая савецкім людзям. «Тэрыторыя, незаконна акупаваная расістамі з ПАР» згадвалася столькі ж, колькі і слова «апартэід» і імя Мандэлы.

Яшчэ Намібію называлі «самай старой праблемай» ААН. З 1946 г. яна дамагалася незалежнасьці. Прэторыя, аднак, не хацела адмаўляцца ад багатай на алмазы тэрыторыі. СССР падтрымліваў намібійскіх партызанаў, ЗША — ПАР. Усё гэта перапляталася з кубінскай прысутнасьцю ў суседняй Анголе. У такіх умовах спэцыяльны пасланьнік ААН вымушаны быў узяць на сябе фактычнае кіраваньне краінай дзеля забесьпячэньня мірнага пераходу да незалежнасьці і правядзеньня першых усеагульных выбараў. Задача была няпростая яшчэ і таму, што абодва бакі вінавацілі фінскага дыплямата ў патураньні ворагу. Тым ня менш, выбары адбыліся, і ніхто іх вынікаў не аспрэчыў. Дваццацігадовая вайна завяршылася, «апошняя калёнія Афрыкі» атрымала незалежнасьць 21 сакавіка 1990 г.

За свае заслугі ў стварэньні новай дзяржавы Ахтысаары атрымлівае званьне яе ганаровага грамадзяніна.

Толькі крытычнае стаўленьне Ахтысаары да амэрыканскай апэрацыі «Бура ў пустыні» перашкодзіла яму заняць пасаду генэральнага сакратара ААН. Ён вяртаецца на радзіму.

У гісторыю Фінляндыі Ахтысаары ўвайшоў як першы ўсенародна абраны прэзыдэнт. Першыя ўсенародныя выбары лідэра краіны ў Фінляндыі адбыліся ў 1995 г. Дагэтуль кіраўніка дзяржавы абірала калегія выбарцаў.

Для Фінляндыі гэта быў пераломны час. Увесь пасьляваенны пэрыяд яе палітыку вызначалі асаблівыя адносіны з СССР. Таму і стаўленьне да яе на Захадзе было насьцярожаным. Існаваў тэрмін «фінляндызацыя», гэта значыць ціхае пашырэньне савецкага ўплыву, якім палохалі Эўропу. Аляксандар Салжаніцын пісаў, што Фінляндыя «ўжо страчаная» для Захаду. Фіны сапраўды былі, магчыма, апошнімі хаўрусьнікамі СССР і нават не хацелі прызнаваць незалежнасьць братняй Эстоніі, пакуль Саюз не перастаў існаваць.

Распад СССР паставіў краіну ў цяжкае эканамічнае становішча і прымусіў наноў вызначаць сваё месца ў сьвеце. Новаму прэзыдэнту ўдаецца арганізаваць эканамічныя інвэстыцыі для краіны і, не парываючы сувязяў з Усходам, арганізаваць уступ Фінляндыі ў Эўразьвяз. Пасьля гэтага пачалі казаць, што на зьмену «фінляндызацыі» Эўропы прыйшла «эўрапеізацыя» Фінляндыі. У перадвыбарную праграму Ахтысаары ўваходзіў актыўны ўдзел краіны ў міжнародных справах. Ужо тады ён адыгрываў не апошнюю ролю ў вырашэньні праблемаў былой Югаславіі. Праўда, пазыцыя Ахтысаары па Босьніі не выклікае падтрымкі ў яго таварышаў па сацыял-дэмакратычнай партыі, і на чарговых прэзыдэнцкіх выбарах кандыдатам ад партыі праходзіць Тар'я Халонэн.

Ахтысаары працягвае займацца міратворчай дзейнасьцю. Сярод аб'ектаў яго ўвагі — Сярэдняя Азія, Інданэзія. За дасягненьне прымірэньня паміж інданэзійскім урадам і сэпаратыстамі Ачэха яго летась вылучылі на Нобэлеўскую прэмію міру.

Дзейнасьць Ахтысаары выклікае розныя ацэнкі. Расея і Сэрбія вінавацяць яго ў патураньні косаўскім сэпаратыстам. Туркмэнскія дысыдэнты — у патураньні рэжыму Туркмэнбашы. Бясспрэчна адно: Ахтысаары, як ніхто ў апошнія гады, спрыяў станаўленьню сваёй краіны як актыўнага чыньніка міжнароднай палітыкі.

# Памежны стан

Там — Эўропа, Эўразьвяз і НАТА. Тут — цішыня закінутых хутароў. Пра Мёршчыну і Браслаўшчыну піша **Сяргей Харэўскі**.

Мяжа з Латвіяй — найстарэйшая ў Беларусі. Фактычна яна ўтварылася ў 1919 г., а заканадаўча была аформленая Рыскай дамоваю 1921 г. Тая польска-латыска-расейская мяжа, што разорам прайшла па беларускай зямлі, захавалася да сёньня. У Латвіі апынуліся Дзьвінск, Краслаўка, Рэжыца, дзясяткі беларускіх вёсак былое Віцебскае губэрні. Старажытнае мястэчка Друя пасеклі папалам. На нашым беразе застаўся Сапежын, а прадмесьце Прыдруйск, што на другім беразе Дзьвіны, апынулася ў Латвіі. Па былой польска-латыскай мяжы праходзяць межы Мёрскага й Браслаўскага раёнаў.

Мёршчына — надзіва раўнінны край, як для Паазер’я. Шырачэзныя разлогі пашаў і выганаў, з усюднай хваёвай стужкаю на даляглядзе. У зіхоткія люстэркі азёраў глядзіцца неба. Мажныя каровы й мітусьлівыя авечкі на зялёных-зялёных лугах у россыпах рознакаляровых валуноў.



**Мёры. Помнік ненароджаным дзецям.**

Пра блізкасьць Латвіі нагадвае й назва вёскі Латышы, хоць латышоў тут даўно ніякіх няма. А вось дзеці амаль усе ў Латвіі. «Там, там», — няпэўна махаючы на поўнач, кажуць тут людзі. Там — Эўропа, Эўразьвяз і НАТА. Тут — цішыня закінутых хутароў.

Пра тое, што гасьцей тут не чакаюць, у Мёрах пераконваесься адразу, як толькі захочаш пад’есьці. Адзіны рэстаран «Чайка» — «на спэцабслугоўваньні», у кавярні «Маладзёжная» нічога гарачага яшчэ не гатавалі. А кошты сталічныя! Пакуль зробяць гарачы рыс з сасіскамі, у пустынным шэрым будынку кавярні можна агледзецца. Усё ж, Мёрскі манастыр згадаў у сваім тастамэнце Сімяон Полацкі. Пэўна ж, неяк быў ён зьвязаны з гэтым кутком.

Ніякіх манастыроў на Мёршчыне няма. Затое ёсьць велізарны й прыгожы касьцёл, у якім вось ужо шмат гадоў шчыруе канонік а. Уладзіслаў Пятрайціс, які адрадзіў каталіцкі друк пабеларуску. Разам зь пісьменьніцай Ірынай Жарнасек ён пачаў выдаваць газэту «Голас душы». Тады, у «перабудову», гэта была падзея нацыянальнага маштабу. Цяпер а.Пятрайціс ачольвае Мёрскі дэканат зь сямнаццаці парафіяў. Дзякуючы яго рупнасьці, беларушчына тут квітнее. Тутсама ладзіцца штогод фэст «Зорка Бэтлеему», што зьбірае па Калядах моладзь і дзяцей Віцебшчыны.



**Ідолта. Касьцёл, пабудаваны ў 1930-я гады.**

Мёршчына — радзіма шмат якіх рэлігійных дзеячоў. Адсюль родам ксёндз і пісьменьнік Ільдэфонс Бобіч, вядомы ў літаратуры як Пётра Просты, адзін з пачынальнікаў беларускага руху ў пачатку XX ст.; грэка-каталіцкі сьвятар Тамаш Падзява, тэоляг і сацыёляг, пэдагог і публіцыст; яго паплечнік біскуп Часлаў Сіповіч, генэрал ордэну марыянаў, заснавальнік Беларускае каталіцкае місіі ў Брытаніі.

Ня пройдзе мінак і міма помніка ненароджанаму дзіцяці, работы скульптара Алеся Дранца, што стаіць перад касьцёлам. Ёсьцека ў Мёрах і выдатны гісторыка-этнаграфічны музэй. Зусім не савецкі. Адкрыты яшчэ *тады*, у 1994. Яшчэ адзін душэўны краязнаўчы музэй у школе. І імпазантная капітальная набярэжная, даўжынёй у паўкілямэтра, з масткамі й парапэтамі, сходамі й лавамі, над чысьцюткім Мёрскім возерам. Патэнцыял велічэзны. А вось жа сёньня падарожжа на Мёршчыну — экстрым. Мабільная сувязь зьнікае. Пра інтэрнэт маўчу. Начаваць і сталавацца турыстам у Мёрах няма дзе. У лесе таксама! Бо памежжа.

Па дарозе на Друю, у бок самай мяжы можна ўбачыць найцікавейшы помнік дойлідства — касьцёл Маці Божай Шкаплернай, пабудаваны ў 1930-я. Суворая й лякацічная, яго архітэктура выклікае ў памяці вобразы раньняга Сярэднявечча. А між тым гэта бэтон і цэмэнт. На імшу сюды зьбіраецца багата народу. І паркуе свае ровары пад касьцёлам. У цішы над-



**Друя. Барысаў камень.**



**Слабодка. Помнік Эўфрасіньні Полацкай.**

вячоркам чуваць толькі рып пэдаляў і шоргат гумовых колаў па пяску.

Дарэчы, на Мёршчыне насамрэч багата помнікаў дойлідства. Мала хто й ведае, напрыклад, пра старажытную званіцу XVI ст., што зьбераглася ў раёне хутароў Навалака, недалёка ад Новага Пагосту, калёну ў гонар нашае Канстытуцыі 1791 году ў Лявонпалі ці пра тамтэйшыя стараверскія цэрквы. Дзіва што: да «абласнога цэнтру» 200 км, а да Менску — 250! Але найпершая праблема тут не адлегласьць, а поўная адсутнасьць хоць якое турыстычнае інфраструктуры. І зьнялюдзеньне. Пакрысе ўздоўж мяжы затухае жыцьцё, зарастаюць вербалозам былыя вёскі, хутары. Зьнікаюць у дзірване калісь брукаваныя дарогі.



**Ідылія пры мяжы. Касьцёл Маці Божай Анёльскай у Мяжанах.**

На Браслаўшчыне — тое самае. Але тут сустракаюцца ўжо й закінутыя фэрмы, нейкія савецкія разваліны… Перарэзаныя, а некалі бойкія, дарогі ў Латвію й Літву. Мяжа. Разышліся берагі. Бальшыня тутэйшых некалі зьехала туды на заробкі. А цяпер ім на Бацькаўшчыну не даехаць. Дарагія візы й білеты, тлум з дакумэнтамі. Высьвятляецца, што дастаць пропуск у памежную цяпер зону надзвычай цяжка і для саміх беларускіх грамадзянаў. Усё залежыць ад ласкі старшыняў сельсаветаў. Паспрабуй тут дамоўся, калі прыехаў зь Віцебску ці Менску! А калі яшчэ й начальнік не зь мясцовых…

Друя сёньня — суцэльная руіна. Адно толькі адноўлены касьцёл і кляштар бэрнардынаў упрыгожваюць навакольле. Некалі акурат тут і быў закладзены славуты асяродак беларускіх марыянаў. Побач з падмуркамі старажытнае сынагогі — нядаўна пастаўлены мэмарыял на месцы адной з самых вусьцішных магілаў Беларусі. Тут увадначас былі забітыя больш як 700 чалавек, жыдоў зь Мёраў, Друі й Лявонпалю. Хоць помнік быў пастаўлены рупнасьцю саміх габрэяў, улады пасьпяшаліся прычапіць тут шыльдачку са сваім гербам і няўцямным надпісам «Воінскае пахаваньне. 5747». А мэмарыял ужо зацягваецца дзірваном. Тутсама, у Друі, захаваўся й велізарны жыдоўскі нэкропаль, на якім ацалелі надмагільлі ажно з XVII ст. Магутнае ўражаньне. І ад маштабаў і ад ашчаднага дагляду. «Во, як габрэі пра сваіх мёртвых клапоцяцца! А нашы й пры жывых нашчадках рады не дадуць»,—



**Люд на памежжы моліцца да Каралевы Азёраў, Маці Божай Браслаўскай.**

кажа мне выпадковы мінак, тутэйшы. І праўда, хрысьціянскія могілкі ў гаротным стане. Дзікасьць і запусьценьне.

А Дзьвіна тут магутная. Велічна й годна нясе свае пругкія воды да мора.

На сутоку з Друйкаю — адзін з Барысавых камянёў. Цяпер расколаты. Тут ціхімі летнімі вечарамі рыбакі адзначаюць свой улоў. Бітае шкло. Нехта немаведама дзеля чаго запэцкаў старажытны камень саляркаю.

На тым беразе — Латвія, колішні Прыдруйск, цяпер Піедруя, НАТА, патэнцыйны праціўнік. Дамы, прынамсі, з вокнамі й дахамі. Зіхцяць купалы царквы й касьцёлу. Спакой і пэўнасьць. Навюткая латвійская застава. Ахайна й дыхтоўна. Кацеры і надзіманыя чаўны памежнікаў выглядаюць цацачна. Але ўсё тут сур'ёзна. Туды дарогі нам няма.



**Знаёмы пэрсанаж. Скульптура працы Пятра Зяляўскага.**

Мужыкі абапал ракі вудзяць рыбу. Стаяў, глядзеў. Думаў, а мо зачэпяцца кручкамі сьпінінгаў. Не чапляюцца. Чыя рыба смачнейшая?

У вёсцы Мяжаны, рыхтык у якім турыстычным буклеце, зграбны касьцёл адлюстроўваецца ў ставе. Касьцёл Маці Божае Анёльскае тут пабудаваў польскі дойлід Юліюш Клос у 1933 г. Ён збудаваў паў-Браслава й палюбіў гэты край. Стары драўляны касьцёл, што ўлады не давалі давесьці да ладу, згарэў у 1985. Але празь дзесяць гадоў яго аднавілі, з цэглы, паводле праекту Ўладзімера Папругі, дойліда-рэстаўратара зь Менску. Прапорцыі й абрыс

Працяг на старонцы 24.

# Памежны стан



**Касьцёл Сьвятых Пятра і Паўла над Дрысьвяцкімі разлогамі.**

**Працяг са старонкі 23.**

былое сьвятыні былі ўзноўленыя дакладна. Пастараль: касьцялок на гары, а пад ім стаў, вакол вады ўсё скошана, стаяць лавы, шапацяць маладзенькія вербы, цікаўна сочыць рудое жэрабя… За імі пустыя навюткія дамы. Аграгарадок.

## «Ня месныя» замест «тутэйшых»

Мястэчка Слабодка, што высока пасела на стромых гарах, крыху вырасла. Вялікія дамы пачалі налазіць адзін на адзін. Цяпер тут нерухомасьць каштуе як пад Менскам. Таму й лезуць. Вакол высачэзнага касьцёлу — кветкі, газоны, новая скульптура сьвятой Эўфрасіньні Полацкай. А вось жа хаты славутага разьбяра Пятра Зляўскага я ўжо не знайшоў. Распытацца ў людзей не атрымалася. «Я не местны», — усё часцей можна пачуць у гэтых краях. Некаторыя скульптуры гэтага народнага генія, старога Зляўскага, які не даваў спакою ані ўладам, ані касьцёльнай грамадзе, зьберагаюцца цяпер у браслаўскіх музэях.

У Браславе, насуперак настойлівай рэкляме, таксама мала дзе можна прыткнуцца. Два невялікія гатэлі запоўненыя цалкам. У адзінай тутэйшай рэстарацыі толкам не паясі. Затое на разьвітаньне бармэнка раіць прыйсьці сюды вечарам на танцы. І праўда, маладухі тут ёсьць рэзвыя… Яшчэ можна схадзіць у кіно, паглядзець альбо жахі, альбо… жахі. Культурная палітыка.

Колісь брукаваныя сьцежкі на Замчышча шчодра заклалі асфальтам. Каб начальства ў машынах ня трэсла. А старасьвецкія будынкі вакол як былі ў занядбаньні, так і стаяць, чакаючы гаспадарскіх рук. Адно толькі, касьцёл стаў нібы нават большым. Вакол яго не сьціхае праца нават на зьмярканьні. Толькі падчас імшы становіцца ціха й урачыста. Тут шанаваны ўсімі каталікамі санктуарый Каралевы Азёраў — Маці Божае Браслаўскае. Гукі сьвятое імшы й сьпевы ліюцца над вечаровым Браславам. Маці Божая Валадарка азёраў, маліся за нас!..

На цьвінтары гарэзяць дзеці, чакаюць бацькоў. Шэпчуцца ў кутку дзяўчаты: «Ну да! Так я шчас і пайду! Вой… нада ж у касьцёл зайсьці, пастаяць, пакуль маці дахаты ня пойдзе…».

## Як і дваццаць гадоў таму

Зрэшты, слаўны Браслаў жыве паўнавартасным жыцьцём. Дзякуючы касьцёлу, музэям і тлумам турыстаў, што наводзяць тут вэрхал тры месяцы на год… Так-сяк, але даглядаюцца тут вакол дарогі, неяк кruцяцца тубыльцы, спрабуючы зарабіць, прымаючы, частуючы й возячы адпачываючых.



**Цілі-цілі-цілі-бом! Мірны атам — у кожны дом! Ігналінская АЭС на тым беразе.**




**Афіша браслаўскага кінатэатру. Што выбраць?**

Але ўжо за якіх кілямэтраў дзесяць у бок мяжы сьляды чалавечага існаваньня зноў прападаюць. Малады камарыны лес становіцца ўсё гусьцейшым. Абапал дарогі велізарныя падмуркі некалі ладных хатаў.

У Дрысьвятах усё тое ж самае, што й было гадоў дваццаць таму. Толькі стала меней людзей, меней машынаў, меней быдла. Няма ў іх і літоўскіх візаў. Дый ня езьдзяць нікуды. Беспрацоўе й нэндза. Адно толькі касьцёл для некаторых — збавеньнем. Праўда, да новага тутэйшага ксяндза ставяцца насьцярожана. Разгаварыць людзей, у чым справа, ня здолеў. Але, кажуць, дзеці яго любяць. Імкнуцца ў касьцёл. «І мае туды хадзяць», — кажа загадчык дрысьвяцкага клюбу. «А Вы самі?» — «А я не мясцовы».

Высьвятляецца, што загадчыкам клюбу працуе былы выпускнік Горацкае сельскагаспадарчае Акадэміі, сам родам з Дубровеншчыны. Заробкам у 400 тыс. задаволены. Іншае працы ў ваколіцах няма. Але як жонка, былая настаўніца, цяпер бяз працы, ды двое дзяцей, то заробак гэты… Толькі азёры й ратуюць — рыба. Дзякаваць Богу, тут яе шмат.

Ідучы па вуліцы Замкавай, з трох хат, падняўся да касьцёлу Сьвятых Пятра й Паўла. Таго самага, у беларускім стылі, што пабудаваў у 1928 годзе Леў Вітан-Дубейкаўскі. Адсюль, са спарадкаванага, нарэшце, касьцёльнага цьвінтара, адкрываецца эпічная панарама на неабсяжныя тутэйшыя азёры, краі якіх сыходзяць за далягляд. Чысьціня й нішчымнасьць.

А на другім баку — ва ўсёй сваёй красе Ігналінская АЭС. І дымок там і пара, рыхтык як зь вясковае хаты. Поўнай нечаканасьцю для мяне стала тое, што ГЭС «Дружба народаў» пасярод Дрысьвятаў належыць... Літве. Як мае быць, плот, дрот. Тутэйшы люд тут болей ні пры чым. Стоячы гэтак блізка, разумееш усю сутнасьць «клопату» пра экалёгію Браслаўскага краю цяперашніх уладаў. То бок сам факт АЭС на беразе Дрысьвятаў яны не аспрэчваюць, бо ж тады трэба замахнуцца на савецкую практыку, а гэта для іх сьвятое… А вось жа паспрабаваць падпаскудзіць суседзям-літоўцам, запярэчыўшы плянам стварэньня радыяцыйнага магільніка пры самой Ігналіне, то гэта можна. Зрэшты, Масква й не такому навучыць. Літоўская грамадзкасьць бязглуздых пратэстаў не заўважыла, а вось эўрапейскія палітыкі яшчэ раз перакананіся, з кім маюць справу ў Менску. Культура палітыкі.

Дарэчы нагадаць, што калі рабілі радыяцыйны магільнік у Маларыце, каб закапаць расейскае «дабро»— заражаны радыяцыяй грунт, што выявілі ў цэнтры Берасьця, пры чыгунцы, нікога не пыталіся. Ані саміх жыхароў Маларыты, ані суседзяў за Бугам.

Зрэшты, шматлікія замеры ў раёне Дрысьвятаў за апошнія гады ніякае радыяцыі тут ня выявілі. Ды й электрычнасьць сюды, да нас, ідзе акурат з тае Ігналіны.

Дарога за Дрысьвятамі, ужо цалкам грунтовая, праз Опсу, вядзе да Відзаў. Шыкоўныя касьцёлы ў Пеліканах, Опсе і Відзах, што ўзвышаюцца над маленькімі мястэчкамі, здалёк выглядаюць ужо зусім сюррэалістычна сярод зьдзічэлага наваколья. Нават ня ведаю, ці цешыцца, што ў Відзах зрэзалі стары парк на плошчы. Нібы й старых дрэваў шкада. І ведаю, што з гэтай уладаю тут нічога добрага ня будзе… Але раскрыўся від на пекны касьцёл, і нібы ў вачах пасьвятлела. Ці тое завецца надзеяй?

Вакол, колькі сягае позірк, не відаць ні слупоў, ні дратоў, ні якіх машын. Спыніўшыся, нават не пачуеш сабачага брэху. Затое можаш убачыць лася, які паважна й салідна будзе разглядаць цябе, з адчуваньнем уласнай поўнай перавагі. Жоравы ходзяць зусім блізка, здаецца, і рукою бы дастаў. Шустрыя бабры ўжо завалілі былыя мэліярацыйныя каналы. Тупік. У засені старых прысадаў, у якіх надвячоркам шнуруюць кажаны, пабачыў руіны велізарнага дому. Пэўна ж, вось тут віравала жыцьцё. Людзі, што сьцягвалі сюды гэтыя велізарныя валуны, рылі склепы, ставілі ставы, садзілі ліпы, думалі пра ўнукаў. А сёньня й не разьбярэш, дзе хто й чыё тут што…. Пры мяжы.

**Здымкі аўтара і Алеся Матафонава**



**Відзы. Парк сякуць — трэскі лятуць.**

# Шчаўе

Піша **Сяргей Харэўскі.**


МАЛЮНАК СЯРГЕЯ ХАРЭЎСКАГА

Гэтая трава з гароду — ці ня самы адметны элемэнт нашае кухні. Шчаўе займае ў кухні беларусаў непараўнальна большае месца, чым у суседзкіх. Гэта ня дзіва, калі ўлічыць, што ў нашым краі ў дзікім стане расьце дзвятнаццаць відаў шчаўя! У ежу і ў якасьці лекаў выкарыстоўваюцца толькі пяць. Усе віды шчаўя — вітамінныя й лекавыя расьліны, што маюць унікальныя ўласьцівасьці паляпшаць страваваньне, загойваць раны, спыняць кроў. Усе яны карысныя пры захворваньнях печані й жоўцевага пухіра, пры анэміі, сардэчна-сасудзістых хваробах.

Навасібірская дасьледчыца А. Майнічава, у сваім артыкуле «Питание переселенцев из Белоруссии в Сибири. Конец XIX—первая треть XX в.», піша, што збор шчаўя быў выключна беларускім заняткам на выгнаньні. Шчаўе тамака не нарыхтоўвалі ані расейцы, ані ўкраінцы. Сібірскія ж абарыгены наагул яго не ядуць. Дарэчы, не шанавалі шчаўя й нашыя татары, знаныя агароднікі.

Між тым, традыцыя ўжываньня шчаўя ў ежу ўзыходзіць да старажытнага Рыму. Шчаўе згадвацца ў камэдыях Плаўта, вершах Вэргілія, у «Натуральнай гісторыі» Плінія Старэйшага.

Шчаўе было добра вядомае і ў ісламскім сьвеце. Арабскія трактаты апісваюць лекавыя ўласьцівасьці шчаўя кіслага садовага. А Авіцэна параўноўвае яго зь дзікім, што на ягоную думку «ва ўсіх адносінах мацнейшае за садовае».

Кісьліня шчаўя залежыць ад утрыманьня ў ім шчаўева-каліевае солі. А вось смакавыя ўласьцівасьці вызначаюцца наяўнасьцю шмат якіх незаменных для чалавека хімічных злучэньняў: арганічныя кісьліні (яблычная, цытрынавая, шчаўевая), бялкоў, цукру, фляваноідаў, караціну й цэлай плоймы каштоўных вітамінаў — B1, B2, C, K, PP!

Аднак менавіта з-за шчаўевае кісьліні й яе соляў шчаўе нельга ўжываць пры мочакаменнай хваробе, пры парушэньнях абмену рэчываў, асабліва салявых адкладаньнях у арганізьме. Наступствы для хворых людзей могуць быць цяжкімі.

Агульнае патрабаваньне да ўсіх страваў са шчаўя: вельмі добрая прамыўка лісьця, замочваньне ў халоднай вадзе на якую гадзінку, кароткі тэрмін гатаваньня, літаральна колькі хвілінаў пасьля закіпаньня…

Ня варта забываць, што нашмат карысьней і ўежней маладое лісьце шчаўя (зь іх утрымліваюцца пераважна цытрынавая й яблычная кісьліні), а старэйшыя, вялікія лісты са сьцяблом патрабуюць пры гатаваньні… крэйды, каб вывесьці ў ападак небясьпечную канцэнтрацыю шчаўевае кісьліні. Для гэтага дастаткова аднаго грама крэйды на кілю лісьця.

Бадай, кожны беларус аднойчы ды жаваў той кіслы лісьцік проста з лугу. Маладое лісьце й плады ўсіх відаў шчаўя маюць вяжучы й абязбольваючы эфэкт, лісьце — гаючае, супрацьзапаленчае, супрацьтаксычнае дзеяньне. Адвары са шчаўя паскараюць утварэньне жоўці, паляпшаюць працу пячонкі, здымаюць алергічныя запаленьні скуры…

Спэцыфічны смак і магутнае тэрапэўтычнае дзеяньне робіць гэтую зялёную траву, што літаральна расьце пад нагамі, — незаменным спадарожнікам беларуса.

У летні сквар можна вырабіць з маладзенькага шчаўя, напрыклад, не-

складаны й смачны салат, а зь перарослага — файны **напой Пярэспа**:

*Бярэм тоўстыя сьцяблінкі перарослага шчаўя, карыцу, імбір, цукровую пудру (лёгка вырабляецца зь любога цукру ў кававым млынку) і …лёд.*

Шчаўе перабраць, прамыць у вялікай колькасьці вады. Лісьце аддзяліць ад сьцяблоў. Сьцяблінкі яшчэ раз перамыць, перакруціць праз, напрыклад, мясарубку, альбо здрабніць у блэндары. Праз марлю (у дзьве столкі) адціснуць сок. Разбавіць на чвэрць халоднай гатаванай вадою. Давесьці да закіпаньня. Пену паздымаць. Усыпаць каліва карыцы і імбіру .

Астудзіць, усыпаць на свой густ цукровае пудры, укінуць кубікі лёду, моцна ўзбоўтаць да ўтварэньня шыпучае пены….

Гэтаксама, пэўна, кожны ласаваўся ў летнюю сьпёку нашым клясычным халадніком, часьцей званым у народзе проста — **шчаўе**:

*Блізу кіля шчаўя; пара цьвёрдых сьвежых агуркоў; 150 г зялёнае цыбулі; столькі ж маладзенькага кропу; шклянка сьмятаны; соль; 2 яйкі.*

Шчаўе прамыць, парэзаць, давесьці да кіпеньня ў падсоленай вадзе, ахаладзіць. Дадаць дробна нарэзаныя сьвежыя гуркі, расьцёртую з сольлю зялёную цыбулю. Запраўляецца сьмятанаю й пасыпаецца падрабнёным кропам (можна й пятрушкаю, і салераю), ужо перад самай падачаю на стол. У талеркі пакласьці пакроеныя яйкі, вараныя ўкрутую.

Гэтак сілкаваліся беларусы апошнія пару тысячаў гадоў. Я цяпер рэкамэндую перад закладаньнем гуркоў і зяляніны даваць кансэрваваных зялёных алівак. Парэзаных напалам.

Ёсьць у нашай шчаўевай кухні й сапраўдныя шэдэўры, напрыклад, **шчупак па-засьцянкоўску**:

*Шчупак — 1.5–2 кг; шчаўе — 2 кг; цыбуля рэпчатая — 2 шт.; ляўровае лісьце — 1 шт.; сухі чабор — 2 ст. лыжкі; зялёная пятрушка — 100–150 г; перац чорны — 2 гарошыны; перац духмяны 1 гарошына; соль — 2 ч. лыжкі; сьметанковае масла — 50–60г; алей — 1 ст. лыжка; вада — 1 шклянка; яйкі; кроп.*

Шчупака чысьцяць, патрашаць, націраюць сольлю, кладуць цалкам (ці найбуйнейшымі кавалкамі) на разагрэтую патэльню з алеем, дадаюць нашаткаваную цыбулю, зьлёгку патоўчаны перац,чабор, ляўровы ліст, заліваюць шклянкаю вады, закрываюць шчыльна, ставяць у гарачую духоўку (печ) і томяць у такім стане паўгадзіны. За гэты час рыбу трэба перавярнуць тры разы. За тры–пяць хвілінаў да канца гатаваньня дадаць сечанае шчаўе зь пятрушкаю(каб яно шчыльна запоўніла ўсю патэльню з накрыўкай).

Дробна накроенае шчаўе зь пятрушкай заліваюць невялічкай колькасьцю вады, пражаць блізу 20 хвілін на марудным агні, адкідваюць на сіта, соль на смак, і… пераціраюць павольна й акуратна з маслам. Атрымаецца духмянае шчаўевае пюрэ. Прысыпаюць зялёным кропам.

Рыбу выкладаюць на талерку, даюць падастыць, заліваюць яе ж падліваю. Прыгожа выглядае, калі шчаўевае пюрэ папярэдне разьмеркаванае па вялікай талерцы, астуджваецца. І тады шчупак кладзецца як на травяны аксаміт зьверху. Абкладваецца накрышанымі крута зваранымі яйкамі, аздабляецца кропам і пятрушкаю. Падаваць лепей, калі ён паляжыць–паастыне.

У клясычнай нацыянальнай кухні шчаўе заўжды спалучалася з грыбамі. Атрымліваецца пікантны тутэйшы характар. Прапаную старасьвецкі рэцэпт, што бытуе й цяпер на Заходнім Палесьсі — **пячыста са шчаўя з грыбамі.** Для гэтае вельмі калярытнае стравы спатрэбяцца ў якасьці спэцпрадуктаў, апроч дзікага шчаўя, сьвежыя грыбы — баравікі, асавікі, махавікі й маладыя парасонікі (дзікія шампіньёны). Грыбоў спатрэбіцца паўкілі. А таксама:

*1 кг шчаўя, абабранага ад чаранкоў, пачышчанага, вельмі ахайна перамытага й прасушанага; 3 ст.лыжкі масла; 3 ст. лыжкі пшанічнае мукі; 2 шклянкі 10%–ных вяршкоў; 3 ст. лыжкі цёртага сыру; 300 г цыбулі; соль; каліва сьвежазмолатага духмянага перцу з мушкатам; белы перац.*

Перадусім, гатуецца грыбны соўс. Дзеля гэтага масла топіцца ў патэльні, кладуцца дробнапасечаныя грыбы й цыбуля й смажацца цягам пяці хвілін. Дадаецца мука, духмяны перац з мушкатам, 2 чайныя лыжкі солі, 1 чайная лыжка алеі, перамешваецца акуратна. Тады танюсенькім цурком уводзяцца сьвежыя вяршкі. Ставіцца зноў на марудны агонь, даводзіцца да закіпаньня. Перамешваецца ўвесь час, павольна й мэтадычна. Гатуецца гэта блізу пяці хвілінаў.

Палову шчаўя (паўкіля) раскладваецца роўным слоем на бляху, змазаную алеем. Затым паліваецца крыху тым атрыманым грыбным соўсам. Можна крышку пасыпааць драбнюсенька пакроенага кропу зь пятрушкаю. Пасыпаецца цёртым сырам.

Наверх кладзецца рэшта шчаўя,выроўніваецца, паліваецца рэштаю соўса й шчодра пасыпаецца сырам. Усё спрысківаецца гатаванаю вадою й ставіцца ў папярэдне моцна разагрэтую духоўку (печ). Гатуецца блізу 35 хвілін.

Пасьля ўсё гэта пасыпаецца крыху зелянінай і …файная пачостка гатовая. Смачней, калі добра астыне. Палешукі запіваюць халодным малаком.

І яшчэ колькі сучасных рэцэптаў:

### Суп спадарскі

*400 г вэнджаных рэбраў, 300 г шчаўя, 4 бульбіны, 1 морква, 1 корань пятрушкі, 2 яйкі, 1 цыбуліна, 1 ч. лыжка сьметанковага масла, 1 ст. лыжка мукі, 4 ст. лыжкі сьмятаны, соль, перац, зеляніна.*

Рэбры пасячы, памыць, заліць халоднай вадой. Калі вада закіпіць, зьняць шум і варыць на слабым агні каля гадзіны. Затым дадаць нарэзаныя кубікамі моркву і бульбу, гатаваць яшчэ 15–20 хвілін.

Шчаўе перабраць, выдаліць чаранкі, прамыць, парэзаць, апусьціць у булён разам з нашаткаванай цыбуляй. Заправіць суп мукою, падсмажанай на масьле і разьведзенай булёнам, дадаць соль, перац, варыць 5–6 хвілін.

У кожную талерку пакласьці скрылькі варанага яйка, пасыпаць дробна нарэзанай зелянінаю, заправіць сьмятанай.

### Халаднік па-менску

*700 г шчаўя, 400 г буракоў, 2 сьвежыя агуркі, 1 яйка, 2 шклянкі кефіру, 120 г зялёнай цыбулі, 2 ст. лыжкі сьмятаны, 1 ст. лыжка цукру, соль, кроп.*

У падсоленай вадзе зварыць прамытае і нарэзанае шчаўе, ахаладзіць. Асобна зварыць цэлыя буракі, абабраць, накрышыць саломкай, зьмяшаць са шчаўем, пакласьці дробна нарэзаную і расьцёртую з сольлю і жаўтком зялёную цыбулю, нашаткаваныя сьвежыя агуркі, пасечаны бялок, цукар, узьбіты кефір.

Халаднік заправіць сьмятанай і пасыпаць дробна нарэзаным кропам.

### Малачнік са шчаўем

*1,5 л малака, 0,5 л вады, 400 г шчаўя, 4 бульбіны, 40 г сьметанковага масла, соль.*

Шчаўе перабраць, старанна прамыць, пасячы. Малако з вадою ўліць у рондаль, даць закіпець. Пакласьці нарэзаную скрылькамі бульбу, праз 5 хвілінаў апусьціць падрыхтаванае шчаўе, пасаліць.

Гатовы суп заправіць сьметанковым маслам.

(Rumex), **род кветкавых расьлінаў сям. драсёнавых. Каля 200 відаў. Пашыраны ў нетрапічных зонах і ў гарах тропікаў. На Беларусі 19 відаў. Найбольш вядомыя Ш.: вераб'інае, або малое, ці шчаўлюк (R. acetosella), кіслае, або звычайнае (R. acetosa), конскае (R. confertus), кучаравае (R. crispus), лясное (R. sylvestris), пірамідальнае (R. thyrsiflorus). Трапляюцца на лугах, узьлесках, травяністых схілах, балотах. Культывуюць садовыя формы й гатункі шчаўя кіслага, вераб'інага і маршчакаватага (R. rugosus).**

**Адна– і шматгадовыя травяністыя і паўкустовыя расьліны выш. да 120 см. Сьцёблы прамыя, разгалінаваныя. Лісьце ў прыкаранёвай разэтцы, суцэльнае, лінейнае ці стрэлападобнае. Кветкі дробныя, сабраныя ў мяцёлчатае суквецьце. Плод арэшкападобны. Лекавыя, гароднінныя, кармавыя расьліны, бальшыня відаў — пустазельле.**


Вялікая летняя вандроўка
1
2
3
4
13
14
15
16
17




**Кідайце кубік і хадзіце па каменьчыках. Пераможа той, хто першы дойдзе да скарбу!**

1. Старт!
2. Спусьціцеся на лодцы ўніз па рацэ.
3. Адпачынак. Прапусьціце ход.
4. Вярніцеся за сякерай.
5. Заплечнік парваўся - прапусьціце ход.
6. Вы заблукалі.
7. Вас падвёз лось.
8. Вы напужаліся прывіда.
9. Бусел дапамог вам пераляцець праз горы.

10, 11, 12 - вы скаціліся са склізкай гары ўніз.

13. Вас схапіў цмок! Вяртайцеся на старт (на нумар 1).
14. Вы пераляцелі на парашуце праз горы.
15. Дрыгва. Прапусьціце ход.
16. Скараціце шлях з дапамогай лодкі.
17. Адпачынак. Прапусьціце ход.

Капітан Танака ©

# Ля касьцёлу Сьвятога Язэпа адкрыюць помнік Яну Паўлу II



7 ліпеня ля касьцёлу сьвятога Язэпа ў Валожыне адбудзецца ўрачыстае адкрыцьцё помніка Папу Яну Паўлу II. Гэта другі такі помнік у краіне. Першы стаіць у мястэчку Мосар пад Глыбокім. «Але ж ён маленькі — кажа пробашч валожынскага касьцёлу **Генрых Акалатовіч (на фота)**. — Вы паглядзіце лепш на наш, яго ж можна паставіць і ў сталіцах».

Айцец Генрых вядзе нас у касьцёл. Ян Павал, у чалавечы рост, яшчэ закручаны ў скотч. Помнік чакае пераносу на пастамэнт.

Помнік рабілі ў Польшчы. Скульптары далі зьніжку: Замест дзесяці тысяч злотых валожынцы заплацілі сем.

Валожынскі касьцёл знаходзіцца на цэнтральнай плошчы гораду.

Ксёндз Акалатовіч паказвае новыя пастамэнты ля касьцельнай званіцы: «Хачу паставіць скульптуры Маткі Божай і Езуса. Дарога вядзе да ЗАГСу, дык каб маладыя пасьля шлюбу ехалі ўскладаць кветкі сюды, а не да Леніна».

Адкрыцьцё помніка адбудзецца у 12.00 7 ліпеня. Мае быць біскуп Антоні Дзем'янка. Накіравалі запрашэньне і новаму старшыню Менскага аблвыканкаму Леаніду Крупцу, але адказу пакуль не было.

**Зьміцер Панкавец, Валожын–Менск**

## Сын Лукашэнкі зацікавіўся гольфам

Днямі Віктар Лукашэнка наведаў гольф-клюб у Нахабіна, што пад Масквой, паведамляе расейская газэта «Московский комсомолец». Газэта зьвязвае візыт Лукашэнкавага сына з будаўніцтвам шыкоўнага комплексу для гольфу каля беларускай сталіцы.

Пад яго аддалі 318 га ў Калодзішчах — прэстыжным пасёлку на паўночным усходзе Менску. Там створаць поле чэмпіёнскае клясы на 36 ямак і пасёлак для гульцоў: гатэль на 100 месцаў і асобныя катэджы. Цэнтар мае адчыніцца ў 2010 г.

Гольф — дарагі від спорту і лічыцца гульнёю арыстакратыі.

Толькі ці не паблытала газэта сыноў? Гольфам мусіў бы цікавіцца ня Віктар, памочнік прэзыдэнта па бясьпецы, а Дзьмітры, малодшы сын, ён кіруе прэзыдэнцкім спартовым клюбам.

## Дарафеева рвецца ў Крэмль

Пасьля «Славянскага базару» зорка агіткампаніі «За Беларусь» Ірына Дарафеева возьме адпачынак і правядзе 7 дзён на Кіпры. Пасьля працягне гастролі па Беларусі «Пад мірным небам» і запіша альбом ва Украіне.

Яшчэ ў бліжэйшых плянах сьпявачкі — сольны канцэрт у Крамлёўскім палацы.

Дарафееву ў Расеі «раскручвае» кампазытар Кім Брэйтбург, які напісаў для яе песьню «Дзяўчына на беразе», а для яе дуэту з Русланам Аляхном — «Сэрца зямлі маёй».

## Сьмерць на корце

У Баранавічах днём на тэнісным корце санаторыя-прафілакторыя «Магістраль» загінуў падлетак. На Віталя, вучня 5-й клясы гімназіі, упаў судзейскі памост.

## Разграмілі два сельсаветы

26 чэрвеня разгрэмілі Бараздоўскі сельскі савет Аршанскага раёну. Супраць пагромшчыка — сына старшыні сельсавету — узбудзілі крымінальную справу.

29 чэрвеня падпалілі Белькаўшчынскі сельсавет Верхнядзьвінскага раёну. Гэта зрабіў 31-гадовы псыхічна хворы інвалід з Наваполацку. І на яго заведзена справа.

## Цяпер Беларусь — частка Паўночнай Эўропы

Па выніках лёсаваньня кваліфікацыйных раўндаў эўрапейскіх футбольных клюбных турніраў у Лізе чэмпіёнаў барысаўскі БАТЭ сыграе з кіпрскім «Апаэлем», а ў Кубку ЎЭФА — менскія і берасьцейскія «дынамаўцы» з латыскімі «Сконта» і «Мэталюргам» адпаведна.

Лёсаваньне было паказальным для краіны. Упершыню ЎЭФА ўключыла Беларусь у паўночны рэгіён. Раней нас адносілі да ўсходнеэўрапейскага рэгіёну.

## Каб атрымаць 100 балаў, трэба слухаць NRM

Алена Цухловіч з Крупак і Таня Варажбіцкая зь Негарэлага здалі тэсты па беларускай мове на 100 балаў. Дзяўчаты займаліся беларускай мовай са школьнымі настаўнікамі, і не карысталася паслугамі рэпэтытараў. Сярод улюбёных пісьменьнікаў дзяўчат — Быкаў, Мележ, Шамякін, сярод музычных гуртоў — «NRM».

## Сканфіскавана 800 кг сала

Двое грамадзянаў Украіны спрабавалі падпольнымі дарогамі ўвезьці ў Беларусь больш за 800 кг сала. Кантрабандысты перавозілі нацыянальны прадукт на дзьвюх падводах. Апроч сала памежнікі знайшлі яшчэ і каля 40 кг памідораў і больш за 100 найменьняў прамысловых тавараў.

## Новы мост на Убарці

27 чэрвеня ў Лельчыцкім раёне адбылося адкрыцьцё новага мосту цераз раку Убарць на дарозе Тураў — Лельчыцы — Славечна — мяжа Украіны. Мост мае ўдоўжкі 148 мэтраў.

**Наталка Харытанюк, Зьміцер Панкавец, МБ; з выкарыстаньнем інф. «Звязды», «Эўрарадыё», БелаПАН, Народных навінаў Віцебску і ўл.інф.**

# Басовішча

## 19—21 ліпеня

**Гарадок**



**У праграме:** трыццаць гуртоў; канцэрт «Вольная сцэна» для музыкаў, якія не прайшлі адбор (19 ліпеня а 16–й); конкурсная праграма; N.R.M., «Палац»…

**Візы:** на сайце http://bas.racyja.com — анкета для збору заявак. Першыя сто чалавек, якія яе запоўняць, атрымаюць візу хутка.

**Даезд:** з памежнага гораду Кузьніца–Беластоцкая будзе арганізаваны бясплатны аўтобус да Гарадка. То бок можна самастойна даехаць да Горадні, а адтуль на цягніку да Кузьніцы. Бясплатны аўтобус будзе адʼяжджаць 19 ліпеня а 15–й (час польскі). Каб трапіць на гэты рэйс з Горадні, трэба выехаць у 14.45 (час беларускі) на цягніку з чыгуначнага вакзалу. Даведкі па т.: (029) 939–40–62.

Інфармацыя пра платны рэйс зь Менску праз т.: 622–57–20



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

## ІМПРЭЗА

### Сустрэча са Зьнічом

**У пятніцу 6 ліпеня ў Менску, у памяшканьні Беларускага ПЭН-Цэнтру** адбудзецца прэзэнтацыя кнігі вершаў вядомага паэта Зьніча — інака Мікалая (у сьвеце Алега Бембеля) «За мурам» з удзелам аўтара. У імпрэзе возьмуць удзел бард Андрэй Мельнікаў і сьпявачка Кася Камоцкая.

**Пачатак а 18-й.** Адрас: вул. Казлова, 7—101. Уваход вольны. Даведкі па т.: 571–26–11, 307–27–13.

## ВЕРА

### Мошчы апостала Лукі

8 ліпеня ў Менск прывязуць голаў апостала Лукі, аўтара аднаго з чатырох Эвангельляў і першага іканапісца. Доступ да мошчаў будзе адкрыты з 15.00 8 ліпеня да 12.00 12 ліпеня ў храме Іконы Божай Маці «Ўсіх смуткуючых Радасьць» (вул.Прытыцкага, 65).



РОГЕР ВАН ДЭР ВЭЙДЭН. «ЭВАНГЕЛІСТ ЛУКА, ЯКІ МАЛЮЕ МАДОНУ»

## РАСКОПКІ

### Шукаем горад Казімер

**10 — 31 ліпеня** добраахвотнікі запрашаюцца ў археалягічную экспэдыцыю на раскопкі былога гораду Казімер, які існаваў у XVII ст. Раскопкі будуць праводзіцца **ў вёсцы Каралеўская Слабада-2** (Краснаўскі сельсавет, Сьветлагорскі р–н). Даведкі: (02342) 4–76–13, e-mail: asvieta2@tut.by (Тэльман Маслюкоў); (029) 567–59–22, e-mail: habdank@rambler.ru (Сяргей Рассадзін).

### Раскопкі пад Адрубамі

**30 ліпеня — 12 жніўня ў Сьветлагорску** арганізуецца моладзевая археалягічная экспэдыцыя. Месца раскопак — **каля вёскі Адрубы Кабанаўскага сельсавету** (Жлобінскі р–н). Экспэдыцыю ладзіць Таварыства беларускай мовы. Раскопкамі кіруе навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Акадэміі навук. **Прыём заявак на ўдзел — да 15 ліпеня.** Даведкі па т.: (02342) 3–43–12 (Вадзім Богдан),(029) 709–04–33 (Андрэй Музычэнка), e–mail: ekspedycyja@tut.by. Падрабязная інфармацыя: http: //svetlahorsk.belarda.org/info/abviestki

## ВЫСТАВА

### «60&30 »

**4 ліпеня а 17-й у Нацыянальным мастацкім музэі** адбудзецца адкрыцьцё выставы «60&30» Людмілы і Максіма Пятруляў. Максім Пятруль — малады скульптар, Людміла Пятруль — мастачка, якая займаецца карцінамі–дыванамі. **Выстава працягнецца да 30 ліпеня.**

## ТЭАТАР

### Купалаўскі тэатар

**5 (чц)** — «Тутэйшыя»
**6 (пт), 8 (ндз)** — «Сны аб Беларусі»
**11 (ср)** — «Ромул Вялікі»
*малая сцэна*
**9 (пн)** — «Апэльсінавае віно»

## КАЛІ Б...

**...улады выкарысталі факт стварэньня арганізацыі «Белая Русь» для паляпшэньня міжнароднага іміджу.**



Беларускі дыплямат: «Вось бачыце — мы выканалі патрабаваньне апазыцыі: ладзім беларусізацыю на дзяржаўным узроўні».



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

### Памежны стан

Там — Эўропа, Эўрасаюз і NATO. Тут — цішыня закінутых хутароў. Рэпартаж зь Мёршчыны і Браслаўшчыны Сяргея Харэўскага.

**Старонка 22.**



## У Будславе на фэсьце

заклалі Паклонную гару.

Старонка 16.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ПРЭЗЭНТАЦЫЯ

**У чацьвер** а 17.30 на ўправе БНФ пройдзе прэзэнтацыя кнігі «Брату» Паўла Севярынца

### КНІГІ

**Спадарства,** у маім кнігазборы няма 1-га т. Збору твораў М. Танка ў 13 тамох. Падкажэце, дзе можна набыць. Анатоль Сідарэвіч. douhiles@mail.ru

**Прапаную кнігі:** Л.Геніюш «Споведзь», «Быкаў на Свабодзе», «Тэўтонскі ордэн», Ткачоў «Замкі і людзі», Ластоўскі, «Наша Ніва» 1906 – 1908, «Наша Доля» 1905, «Палітычныя партыі Беларусі», «Беларускі кнігазбор» ды шмат іншага, багаты выбар. Т.: 753-70-05

**Абмен культуралягічнай інфармацыяй,** кнігамі. Дашлю сьпіс прапаноў. Канфэрэнцыі, літаратурныя вечарыны, выдавецкія праекты. Ад Вас — капэрта са зваротным адрасам. а/с 195, 220030, Менск. alesknigi@mail.ru

### ПРАЦА

**Дзяўчына-філялягіня** шукае любую працу, зьвязаную з тэкстамі. Вялікі вопыт працы. Т.: 174-98-91





# А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста падпішыце дамову. Дэталі — **старонка 17.**

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Бітва ў Івенцы**

Дрэнная выйшла тут справа з-за крыжа хрысьціянскага. У Івенцы ёсьць касьцёл і цэрква. Цэрква перароблена з даўнейшага касьцёлу. Каталікі-мяшчане паставілі пасьля «свабоды» 4 крыжы ў мястэчку і хацелі паставіць пяты крыж каля цэрквы. І паставілі. Але па цяперашняму закону каталікі ня мелі права ставіць крыж свой каля цэрквы, і выйшаў прыказ земскага перанесьці.

Калі прыехаў прыстаў выкапаць той крыж і пераставіць на могілкі, сабралася шмат баб. Бо івенецкія мужчыны блізка ўсе муляры і расходзяцца летам на работу.

Як толькі паліцыя пайшла з могілак, мяшчане забралі крыж і бочнымі вуліцамі панесьлі яго і ўкапалі зноў недалёка ад таго месца, дзе ён стаяў даўней, каля агароду Бурака. Тут паліцыя наляцела на народ з нагайкамі. У стражнікаў паляцелі камяні. Паўліна Мікуцкая сьцягнула нават стражніка з каня, хоць яна і яшчэ 4 кабеты былі пабіты нагайкамі. Адным словам, выйшла бітва.

Не абышлося і без крыві. Стражнікі пачалі страляць, і забіта была Нядзьведзкая, старушка 63 гадоў...

**«НН». №25. 1907**


# Наша Ніва

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| шэф-рэдактар | Андрэй Дынько |
| галоўны рэдактар | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| заснавальнік | Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва» |
| выдавец | Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**


© **НАША НІВА**.

Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 04.07.2007.

Замова № 3608.

Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.